ЦІ КАРЫСНЫЯ ЗІМОВЫЯ ПАМІДОРЫ І АГУРКІ?

4

ВЁСКА-СЕЛЬСАВЕТ І ЯЕ ЖЫХАРЫ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 СТУДЗЕНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 10 (29124)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Павел КАЛАУР, старшыня праўлення Нацыянальнага банка:

«Меры па павышэнні сукупнай эфектыўнасці эканомікі павінны суправаджацца падтрыманнем здаровага і зразумелага макраэканамічнага асяроддзя, у аснове якога — манетарная і фінансавая стабільнасць. Гэта падмурак доўгатэрміновага эканамічнага росту».

КАРАТКА

- Стартавала галасаванне балельшчыкаў за найлепшую ідэю талісмана хакейнага ЧС-2021.
- **Больш за 10 мільёнаў электронных рэцэптаў выпісана ў Беларусі за 2019 год.**
- У Гомельскай вобласці зацвілі персікі.

- **«Мотаршоу-2020» у Беларусі не адбудзецца.**
- Гарадзішча жалезнага веку на тэрыторыі Нежынскага ГУКа выключаць са спісу гісторыка-культурных каштоўнасцяў.
- **МАРГ заключыў пагадненне з аператарамі сувязі аб стрымліванні цэн на паслугі ў 2020 годзе, якім прадугледжана павышэнне тарыфаў не вышэй за базавы ўзровень інфляцыі, г. зн. 4 %.**
- Toyota укладзе каля $400 мільёнаў у вытворчасць лятучых таксі.

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТРЭБА СКАРЫСТАЦЦА ГЭТЫМ МОМАНТАМ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў прэм'ер-міністру Латвіі адкрыта абмеркаваць усе пытанні, якія існуюць ва ўзаемаадносінах дзвюх краін

Візіт кіраўніка латвійскага ўрада Крыш'яніса Карыньша ў Мінск распачаўся ўвечары 15 студзеня. Раніцай наступнага дня з ім сустрэўся спачатку прэм'ер-міністр Беларусі, потым — Прэзідэнт краіны.

СТАР. 2

Фота БелТА.

ДРУГОЕ ВЯРТАННЕ МЯЧА

Старажытны меч, якому ні больш ні менш — пяцьсот гадоў, першы раз вярнуўся да людзей сем гадоў назад. Яго тады знайшлі ў рацэ Віхра пад Мсціславам разам з рыцарскімі даспехамі, якія адносяць да XV — пачатку XVI стагоддзя. Пасля гістарычная зброя загадкава знікла, яе шукалі доўгія шэсць гадоў — і знайшлі. Меч вярнуўся ў сцены Музея гісторыі Магілёва. Гэтым разам, трэба думаць, надоўга.

Фота БелТА.

Знаходкі

ВЕСТКІ З МІНУЛАГА

У Гродне знойдзены арыгіналы некалькіх франтавых малюнкаў Васіля Быкава

Пра гэта паведаміў у сацыяльных сетках Сяргей Шапран, біёграф пісьменніка. На яго думку, факт існавання такіх малюнкаў сам па сабе неверагодны, бо лічылася, што франтавыя малюнкі згарэлі з рэчмяшком у 1945 годзе. Менавіта так сцвярджаў і сам Васіль Быкаў. Але аказалася, што некалькі замалёвак захоўвалася да гэтага часу ў адным з прыватных архіваў у абласным цэнтры.

Знойдзены тры арыгінальныя копіі графічных накідаў франтавога перыяду жыцця Васіля Быкава. Гэта «Камбат 2. Старшы лейтэнант Ахрын. 1945 г.», «Камандзір гарматы старшы сяржант Прастакоў» і «У раўчуку Саколе». Магчыма, гэтыя надпісы на адваротным баку малюнкаў зроблены самім аўтарам. Накіды апублікаваны ў 1970 годзе ў часопісе «Дружба народов». Праўда, там іх было чатыры.

І вось цяпер ваенныя копіі трох арыгіналаў знайшліся. На жаль, сярод іх не аказалася чацвёртага малюнка, на якім адлюстравана дзяўчына з санітарнай службы. Местазнаходжанне гэтага накіда невядома. Магчыма, і ён адшукаецца, як тры іншыя, якія таксама лічыліся страчанымі.

Між тым арыгінальныя копіі, якія былі зроблены Васілём Быкавым падчас яго знаходжання на фронце, да гэтага часу захоўваліся ў асабістым архіве гродзенскага журналіста, ветэрана вайны Івана Глухава. Яны з Быкавым былі землякі, абодва франтавікі, пазнаёміліся ў «Гродзенскай праўдзе», дзе бралі ўдзел у рабоце літаратурнага аб'яднання. Ёсць думка, што малюнкі Быкаў выслаў Глухаву па яго просьбе і, магчыма, забыўся аб гэтым.

СТАР. 3

«ТРЭБА СКАРЫСТАЦЦА ГЭТЫМ МОМАНТАМ»

ГЛЯДЗЕЦЬ НАПЕРАД

На пачатку сустрэчы Прэзідэнт нагадаў, што дзве краіны звязвае многае. «У нас былі вельмі блізкія адносіны, не проста сяброўскія — блізкія. Нашы эканамічныя сувязі былі вельмі моцныя. Многае мы страцілі за апошнія гады, але важна не столькі глядзець назад, колькі звяртаць сваю ўвагу, свой позірк наперад, — заўважыў ён. — І ў гэтым плане акрэслена шмат кірункаў супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Латвіяй».

У адрозненне ад іншых балтыйскіх дзяржаў, Латвія захавала добры фон для ўзаемадзеяння з Беларуссю, дадаў Прэзідэнт. «Думаю, нам трэба скарыстацца гэтым момантам і сур'ёзна пашырыць наша супрацоўніцтва. ***Тым больш што ад пашырэння гэтага супрацоўніцтва мы бачым вялікую карысць, калі казаць пра эканоміку, як для Латвіі, так і для Беларусі»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт дадаў, што абодва бакі вельмі сур'ёзна рыхтуюцца да яго візіту ў Латвію, і падзякаваў за запрашэнне наведаць гэту краіну.

«Ваш візіт сёння ў Мінск я разглядаю як сур'ёзны этап падрыхтоўкі дамоўленасцяў, якія могуць быць канчаткова зацверджаны падчас майго прыезду ў Рыгу», — пракаментаваў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гатовы адказаць на любыя пытанні госця. «Трэба абмеркаваць усе гэтыя пытанні, каб мы дакладна, шчыра ішлі на супрацоўніцтва адно з адным, каб потым не папракаць адно аднаго, і не пераадольваць бар'еры, якія можам стварыць у выпадку, калі не дамовімся альбо не абмяркуем тыя ці іншыя праблемы сёння».

«І МЫ АДКРЫТЫЯ ДЛЯ БІЗНЕСУ»

Прэм'ер-міністр Латвіі распачаў размову з беларускім Прэзідэнтам па-руску, але потым перайшоў на англійскую, якую ведае лепш. Крыш'яніс Карыньш нарадзіўся і атрымаў адукацыю ў ЗША, мае двайное грамадзянства — латвійскае і амерыканскае. «Каб вам лепш размаўляць на нашай мове, вы да нас часцей прыязджайце», — прапанаваў госцю беларускі лідар. «Я рад буду», — пагадзіўся кіраўнік латвійскага ўрада.

«Мы зацікаўлены развіваць добрыя адносіны з Беларуссю, для нас важна бачыць незалежную, стабільную і квітнеючую Беларусь», — запэўніў ён і назваў дату, якую прапаноўвае латвійскі бок для візіту Аляксандра Лукашэнкі ў Рыгу, — 3 красавіка.

«Мы будзем вельмі рады бачыць вас і, канешне, спадзяёмся, што, калі будзе такая магчымасць, вы прыедзеце з бізнес-дэлегацыяй, каб мы маглі абмяркоўваць не толькі палітычныя, але і вельмі практычныя, канкрэтныя пытанні», — сказаў прэм'ер.

Гэтым разам кіраўнік латвійскага ўрада прыехаў разам з прадстаўнікамі спартыўнай сферы. «Мы вельмі рады магчымасці разам з вамі праводзіць чэмпіянат (чэмпіянат свету па хакеі. — **«Зв.»**) у наступным годзе. І я магу сказаць, што ўсё, што датычыцца падрыхтоўчых работ з нашага боку, усё адбываецца па плане, — праінфармаваў Крыш'яніс Карыньш. — І што асабліва прыемна — латвійская і беларуская каманды ў розных дывізіёнах, так што, магчыма, у канцы мы сустрэнемся ў Мінску».

Пераходзячы да пытанняў эканомікі, прэм'ер-міністр Латвіі паведаміў, што ўрад яго краіны нядаўна цалкам узяў пад свой кантроль кіраванне партамі Рыгі і Вентспілса. «І мы адкрыты для бізнесу», — дадаў ён.

Напрыканцы сустрэчы Крыш'яніс Карыньш падарыў Прэзідэнту Беларусі хакейны світар латвійскай зборнай з прозвішчам Лукашэнка і нумарам 01. Беларускі лідар, у сваю чаргу, падарыў госцю статуэтку зубра.

❍ У ТЭМУ

«Для латвійскага ўрада крайне важна працаваць над тым, каб паляпшаць адносіны з нашым вельмі добрым сябрам Беларуссю — і рабіць гэтыя адносіны больш трывалымі, — пракаментаваў журналістам вынікі сустрэчы з беларускім лідарам Крыш'яніс Карыньш. — Мы лічым, што існуе вялікі патэнцыял для таго, каб зрабіць гэтыя стасункі яшчэ лепшымі як на палітычным, так і на эканамічным узроўні. Калі казаць пра эканамічныя адносіны, вядома, транспарт, лагістыка — гэта самыя відавочныя кірункі, дзе ў нас ужо ёсць напрацоўкі».

Прэм'ер-міністр дадаў, што з Беларусі праз латвійскія парты можна транспартаваць нафтапрадукты ва ўсе краіны свету. «Можна абмяркоўваць і магчымасць імпарту нафты з іншых краін свету ў Беларусь, — дадаў ён. — Мы ўжо абмяркоўваем такія магчымасці, але, вядома, кампаніям трэба вывучыць гэта пытанне, бо бізнес павінен быць узаемавыгадны».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўрадзе

НАМ — ПОРТЫ, ВАМ — ВОЛЬТЫ

Транспартна-лагістычная сфера заўсёды была стратэгічным кірункам супрацоўніцтва Беларусі і Латвіі. Пра тое, што гэтаму аспекту неабходна надаць новае дыханне, у тым ліку выкарыстоўваючы патэнцыял літоўскіх партоў, гаварылі на сустрэчы прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС і яго калега з Латвіі Крыш'яніс КАРЫНЬШ.

«Беларусь як краіна, якая не мае выхаду да мора, вельмі зацікаўлена ў патэнцыяле латвійскіх партоў для перавалкі самых разнастайных беларускіх грузаў. І мы таксама дамовіліся, што ў рабоце міжурадкамісіі, якую ўзначальваюць нашы міністры транспарту, гэтае пытанне будзе адно з асноўных», — сказаў кіраўнік беларускага ўрада.

Станоўчае «напружанне» адносінам нададуць прамыя пастаўкі беларускай электраэнергіі ў Латвію. Гэта пытанне прапрацуюць адпаведныя міністэрствы дзвюх краін.

Сяргей Румас выказаў удзячнасць за падтрымку Латвіі ў выбудоўванні дыялогу Беларусі з Еўрапейскім саюзам, выказаў зацікаўленасць у пашырэнні інструментаў фінансавай і тэхнічнай дапамогі Еўрасаюза і большым выкарыстанні патэнцыялу «Усходняга партнёрства» для развіцця беларускай эканомікі.

Таксама ўчора ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Крыш'яніс Карыньш разам з Сяргеем Румасам узяў удзел у пасяджэнні беларускага і латвійскага аргкамітэтаў па падрыхтоўцы да чэмпіянату свету па хакеі — 2021. Кіраўнік беларускага ўрада ўпэўнены, што сумеснае правядзенне спартыўнага спаборніцтва ўзмоцніць сяброўскія адносіны краін. Крыш'яніс Карыньш запэўніў, што Латвія прыме ўсе меры, каб зрабіць больш камфортным праходжанне граніцы падчас чэмпіянату.

У канцы афіцыйнага візіту прэм'ер-міністр Латвіі разам з беларускім калегам наведаў Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Міхаіл Мішусцін прызначаны прэм'ер-міністрам Расіі

Адпаведны ўказ падпісаў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, адзначаецца ў дакуменце, апублікаваным на сайце Крамля. Перад гэтым дэпутаты Дзярждумы ўхвалілі прызначэнне Міхаіла Мішусціна прэм'ер-міністрам. 383 дэпутаты прагаласавалі «за», 41 устрымаўся. Дума ўпершыню прагаласавала за прэм'ера без адзінага голасу «супраць», але з тымі, хто ўстрымаўся. Сярод прыярытэтаў будучага ўрада Мішусцін назваў аднаўленне даверу бізнесу да дзяржавы, стварэнне адраснай сістэмы сацыяльнай дапамогі праз адзіную базу даходаў хатніх гаспадарак, падтрымку абароннай прамысловасці.

ЗША і Кітай падпісалі частковую гандлёвую здзелку

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп і віцэ-прэм'ер Дзяржсавета Кітая Лю Хэ падпісалі частковае гандлёвае пагадненне, якое заклікана знізіць напружанасць у кітайска-амерыканскай гандлёвай вайне, якая працягвалася апошнія паўтара года. Па ўмовах здзелкі КНР павінен купіць амерыканскія тавары і паслугі на суму 200 мільярдаў долараў. У тым ліку гаворка ідзе пра экспарт у Кітай прадукцыі амерыканскай прамысловасці, сельскагаспадарчых тавараў і энерганосьбітаў. Злучаныя Штаты пагадзіліся ў два разы знізіць некаторыя дадатковыя тарыфы наўзамен на абяцанні Пекіна ў сферы абароны інтэлектуальнай уласнасці і гатоўнасць імпартаваць больш амерыканскіх тавараў. У той жа час многія экспартныя тарыфы, устаноўленыя паміж дзвюма краінамі падчас гандлёвай вайны, застаюцца ў сіле, і, па словах экспертаў, самыя складаныя супярэчнасці яшчэ трэба будзе ўрэгуляваць.

Упершыню высокую пасаду ў Ватыкане заняла жанчына

Папа Рымскі Францыск прызначыў намеснікам сакратара па адносінах з дзяржавамі (адпавядае МЗС) Францэску Дзі Джавані. Як адзначыла агенцтва ANSA, жанчына ўпершыню заняла такую высокую пасаду ў Дзяржсакратарыяце (урадзе) Ватыкана. 66-гадовая Дзі Джавані — спецыяліст па адміністрацыйна-юрыдычных пытаннях, амаль 30 гадоў працуе ў Ватыкане. З 1993-га яна была супрацоўніцай сакратарыята, займалася праблемамі бежанцаў, міжнароднага гуманітарнага права, пытаннямі інтэлектуальнай уласнасці і турызму, а таксама правоў жанчын. Папа Францыск неаднаразова раней выказваўся за больш актыўную і важную ролю жанчын у Рымска-каталіцкай царкве. У ходзе яго пантыфікату жанчына — Барбара Ята — упершыню ўзначаліла Ватыканскія музеі.

❍ БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ТРАДЫЦЫЯ НЕ ПАРУШАЕЦЦА

Чарговыя прамыя тэлефонныя лініі пройдуць у суботу 18 студзеня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме.

На званкі жыхароў краіны з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

* намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

* першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

* намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

* першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алейзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

* намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

* намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;

* намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

Клаксон

РЫНАК АЎТО НА ЎЗДЫМЕ

А беларускі Geely Atlas — на ганаровым трэцім месцы сярод самых папулярных марак

Учора Беларуская аўтамабільная асацыяцыя агучыла вынікі продажаў аўтамабіляў мінулага года. Беларусы купілі ў аўтасалонах 64 504 новыя легкавыя аўтамабілі, пабіўшы ўсе папярэднія рэкорды. Бо ў 2018-м было прададзена на 22 % менш (52,8 тысячы новых аўто).

У першай пяцёрцы самых прадаваных марак невялікія змены. Расійская Lada ўсё ж выйшла на першае месца па агульным аб'ёме продажаў, зрушыўшы з верхняй прыступкі Renault. У лідара 16 281 прададзены аўтамабіль супраць 11 370 штук у другога месца. З такім вынікам Lada займае 27 % рынку. Volkswagen застаўся на трэцім месцы з паказчыкам 7258 аўто і ахопам 12 % рынку. Geely, нягледзячы на амаль двухразовы прырост продажаў у параўнанні з папярэднім годам, па-ранейшаму на чацвёртым месцы з вынікам 6894 аўтамабіляў. Але адставанне ад трэцяга месца не такое вялікае. Паколькі завод дамовіўся з банкамі на падаўжэнне льготных умоў крэдытавання, ён мае шанц заскочыць на п'едэстал гонару налета. Тым больш у айчыннага вытворцы ў лютым з'явіцца яшчэ адна мадэль красовера, якая павінна прыцягнуць новых пакупнікоў, але пра гэта пазней.

А самы прадаваны клас асобных машын у 2019 годзе — B (груба кажучы, бюджэтныя седаны). На яго долю прыпадае 46,7 працэнта ўсяго рынку. Выходзячы з гэтага, цалкам лагічна, што лідарам продажаў стала Lada Vesta з паказчыкам 7585 аўтамабіляў. На другім месцы па папулярнасці — Volkswagen Polo (5804 машын). І на трэцяе месца (замест Logan) вырваўся Geely Atlas. Усяго наш завод летась прадаў 3320 красовераў гэтай маркі. У асацыяцыі такі паказчык назвалі вялікім дасягненнем для «БелДжы». У дзясятку самых прадаваных машын заскочыў сабрат Atlas — Emgrand X7, які рэзка набраў абароты: з 500 машын у 2018 годзе да 2237 у 2019-м.

Увогуле беларускі завод летась вырабіў 20 151 аўтамабіль, а ўсяго з яго канвеера сышло больш за 50 тысяч адзінак гэтай складанай тэхнікі. **Дырэктар прадпрыемства «БелДжы» Генадзь СВІДЗЕРСКІ** лічыць, што брэнд Geely імкліва набірае папулярнасць. Калі ў 2017 годзе аб'ём вытворчасці ў краіне складаў усяго 480 аўтамабіляў, то ўжо ў 2018-м ён вырас амаль у 10 разоў. Летась у завода новыя паказчыкі: 6894 Geely прададзена айчыннаму пакупніку. Завод умацаваўся на расійскім рынку, тут аб'ём продажаў склаў больш за 100 мільёнаў долараў. Акрамя таго, цяпер актыўна вядуцца перагаворы з прадстаўнікамі такіх краін, як Арменія, Казахстан, Азербайджан, Украіна, Сербія, Літва, Польшча і Таджыкістан.

Акцыянернае таварыства «БелДжы» мае намер у лютым гэтага года вывесці на рынак Беларусі новы красовер Geely SX11. На пытанне, ці пашыраць банкі на новую мадэль праграму крэдытавання з ільготным перыядам, Генадзь Свідзерскі адказаў: «Думаю, што так». Пры гэтым ён дадаў, што ўсё будзе вызначаць попыт.

Сяргей КУРКАЧ.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, начальніку галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Ляўковіч Ірыне Пятроўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ВЕСТКІ З МІНУЛАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Усплылі» яны нечакана. І тут прасочваецца цікавы ланцужок падзей. Як ні дзіўна, але не абышлося без дапамогі вышэйшых сіл. Аказваецца, гэтыя малюнкі ўбачылі свет дзякуючы святару гродзенскай Уладзімірскай царквы Андрэю Яварэцу. Менавіта яму паказаў дамашні архіў сын Івана Глухава. Затым аб унікальнай знаходцы паведамілі біёграфу пісьменніка, які і напісаў пра гэта на сваёй старонцы ў Facebook. Таксама ён дадаў, што малюнкі знаходзяцца ў сына Глухава, які жыве ў Маскве, і той можа перадаць іх разам з перапіскай у музей Васіля Быкава ў Гродне.

Як вядома, пісьменнік жыў у гэтым горадзе больш за дваццаць гадоў, працаваў стыль-рэдактарам у абласной газеце. Некаторыя яго рэчы захоўваюцца ў музейным пакоі рэдакцыі. Да нядаўняга часу ў Гродне быў і асобны музей Васіля Быкава ў цэнтры горада. Праўда, мала хто ведаў пра той невялікі пакой, экспазіцыю якога стварылі і падтрымлівалі толькі энтузіясты гэтай справы. Летась музей перастаў існаваць, а ўсе экспанаты былі перададзены ў літаратурны аддзел Дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, які вядомы як музей Максіма Багдановіча. Яго **загадчыца Алена РАПІНЧУК** паведаміла, што ўсяго была перададзена каля 600 экспанатаў. Большую іх частку складае бібліятэка, але ёсць таксама цікавы і ўнікальны архіў, асабістыя рэчы пісьменніка. Гэта значна папоўніла ўжо існуючы фонд экспазіцыі Быкава. У музеі з'явіліся тры вітрыны для новых экспанатаў.

— Нам перададзены з музея «дыпламат» пісьменніка, сумка, шалік, гальштук, барэт, кашуля, фрэнч, скураны рэмень, кавaварка, радыёпрыёмнік. Таксама аўтаручкі, ножык для наразання паперы, дыктафон, — пералічвае Алена. — Тут мы бачым паштоўку, якую Васіль Быкаў даслаў свайму сыну Васілю. Пісьменнік віншуе яго з днём нараджэння. Дарэчы, малодшы Васіль жыве і працуе ў Гродне. Другі сын Сяргей — у Мінску.

Таксама з цікавых экспанатаў — віншавальная тэлеграма Быкаву ад Міхася Лынькова, замежны пашпарт пісьменніка, яго прафсаюзны білет, пасведчанні, мандаты. Яшчэ ёсць яго візітоўка з адрасам па вуліцы Свярдлова. Кватэра па-ранейшаму належыць сям'і Быкава, тут жыве яго ўнук Яўген з сям'ёй.

З фонду перайшло сюды нямала рукапісаў, фотаздымкаў. А вось малюнкаў Быкава ў музеі пакуль няма, Хоць вядома, што Васіль Уладзіміравіч нярэдка браўся за аловак і нават вучыўся на мастака. У 50-х гадах пісьменнік часта сам ілюстраваў свае апавяданні.

Існуе нямала яго накідаў, якімі ён дапаўняў сваю біяграфію ў кнізе «Пункціры жыцця». Але ўсе тыя малюнкі зроблены ў пасляваенны перыяд, у адрозненне ад цяперашняй знаходкі.

Праўда, у блакноце Быкава, што знаходзіцца ў музеі, можна ўбачыць разам з радкамі тэксту схематычны малюнак мясцовасці з рэчкай, мосцікам і дрэўцамі. Як растлумачыла Алена, гэта рукапісны тэкст твора «Аблава» — планы, накіды, запісы. Побач з рукапіснымі праўкамі знаходзіцца надрукаваны на машынцы твор «Знак бяды». Ёсць аўтабіяграфія, напісаная рукой пісьменніка. Асобна можна прачытаць вытрымку, якая таксама напісана ўласнаручна: «Народ, які імкнецца ў будучыню, павінен даражыць сваёй мінуўшчынай ужо хоць бы з тае прычыны, што ў ягоным мінулым выпрацоўваецца ягоная культура, яго гісторыя, ягоны лёс». Гэтыя словы, здаецца, так і просяцца, каб занесці іх на мемарыяльную дошку альбо бюст Васіля Быкава.

Гродзенскі краязнаўца і гісторык Алесь Госцеў — у ліку актыўных прыхільнікаў гэтай ідэі. Ён таксама быў знаёмы з Быкавым і нават атрымаў ад яго віншавальную паштоўку, якую беражліва захоўвае. Таксама беражліва трэба адносіцца і да памяці пісьменніка, лічыць гродзенскі краязнавец.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ТРУБАЧ АБВЕСЦІЦЬ ПОЎДЗЕНЬ

У Брэсце стартуе новая традыцыя — трубіць апоўдні.

Пра гэта гаварылі яшчэ напярэдадні святкавання тысячагоддзя, але ўвасобіць ідэю ў жыццё ўдалося толькі цяпер. Для гэтага спатрэбіліся энтузіязм, жаданне, ну і, вядома, грошы. Група гарадскіх актывістаў, неабыякавых да мінулага і сучаснага малой радзімы, змагла акумуляваць усё пералічанае і запусціць праект пад назвай «Берасцейскі трубач».

Як вядома, Брэст першы з беларускіх гарадоў атрымаў магдэбургскае права. Ад гэтага і адштурхоўваліся арганізатары. Вядома, што горад меў ратушу з гадзіннікам. Хутчэй за ўсё, быў і трубач, які абвяшчаў важныя падзеі і надыход поўдня. Цяпер ён з'явіцца зноў. Брэсцкі трубач пратрубіць поўдзень з судзейскай вежы на Вяслярным канале, размешчанай на шостым паверсе. Роўна ў 12 гадзін ён будзе падаваць тры сігналы, тым самым пацвярджаючы, што горад жыве ў парадку і бяспецы.

Такім чынам, да вядомага ліхтаршчыка, які працуе на вуліцы Савецкай і стаў адной са славутасцяў горада, дадаецца трубач. Першы рытуал падачы сігналу адбудзецца сёння 17 студзеня. Падрабязнасці — у адным з найбліжэйшых нумароў газеты.

ЗНАЙШОЎ МІНУ... І ПАНЁС ЯЕ Ў ЛЕС

Гаспадар з вёскі Малькавічы Ганцавіцкага раёна, што на Брэстчыне, добраўпарадкоўваў свой участак і адкапаў прадмет, падобны на снарад часоў мінулай вайны. Мужчына ўзяў цяжкі металічны боепрыпас і панёс яго ў лес, а затым ужо пазваніў у міліцыю.

Паводле слоў **намесніка начальніка Ганцавіцкага РАУС Максіма ЛУК'ЯНЧЫКА**, пасля таго як у дзяжурную часць паступіла паведамленне ад вяскоўца, на месца выехала сапёрна-піратэхнічная група вайсковай часці. Ваеннаслужачыя высветлілі, што знаходка з'яўляецца мінамётнай мінай часоў Вялікай Айчыннай вайны. Потым спецыялісты абследавалі агарод і ўчастак грамадзяніна, але іншых боепрыпасаў не знайшлі. Міна пазней была абясшкоджана.

Міліцыянеры ж яшчэ раз нагадалі, што нельга дакранацца да боепрыпасаў, нават старых і ржавых. Калі вы знайшлі іх, адразу тэлефануйце ў міліцыю і памятайце, што самастойныя дзеянні могуць справакаваць выбух, наступствы якога нельга спрагназаваць. Добра, што ганцавіцкаму агародніку пашанцавала. Але не варта забываць, што ў нашай гісторыі здараліся і трагічныя фіналы падобных знаходак.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

МУЖЧЫНУ ЗАЦІСНУЛА СТОЛЛЮ

Удзень ратавальнікам паступіла паведамленне пра абрушэнне столевага перакрыцця ў доме на 1-м Трактарным завулку ў Віцебску.

Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, высветлілася, што здарэнне адбылося ў пакоі аднапавярховага цаглянага жылога дома, у выніку чаго быў зацiснуты мужчына, які знаходзіўся ў прытомнасці.

Як паведамілі ў МНС, хутчэй за ўсё пацярпелы праводзіў работы па дэмантажы керамічнай пліткі са сцен пры дапамозе перфаратара. У нейкі момант і адбылося абвальванне перакрыцця — мужчына апынуўся пад завалам.

Работнікамі МНС пацярпелы быў выняты і перададзены брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пасля агляду ён адмовіўся ад шпіталізацыі. Прычына здарэння высвятляецца.

«АБУЛІ» НА ДАВЕРЫ

Жыхарка Полацка атрымала ў сацыяльнай сетцы паведамленне ад сяброўкі, у якім тая прасіла дапамагчы з купляй абутку. Па словах жанчыны, яна ўжо нагледзела неабходныя абноўкі, але ўзніклі праблемы з карткай. З-за гэтага немагчыма было аплаціць тавары.

Палачанка, не здагадваючыся, што стасункуецца з махлярамі, адказала, што на яе картцы сродкаў няма, але ёсць у мужа. Як толькі жанчына адправіла неабходныя зламыснікам фота, з рахунка мужчыны была спісана сума ў 2282 рублі. Пасля гэтага пацярпелая звярнулася па дапамогу да праваахоўнікаў.

УУС Віцебскага аблвыканкама нагадвае, што нумары, рэквізіты картак, ПІН- і CVV-коды, сеансавыя аднаразовыя паролі, якія прыходзяць у SMS-рассылках, ні ў якім разе нельга паведамляць каму б там ні было. Нельга перасылаць фота з нумарамі і паролямі картак у інтэрнэце.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Надвор'е

НЕ ЦЁПЛА, АЛЕ І НЕ ХОЛАДНА

Менавіта так ахарактарызавалі сіноптыкі надвор'е на Вадохрышча. Студзень сёлета працягвае тэндэнцыі анамальна цёплага снежня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А да канца тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны ў асноўным вызначыць вобласць павышанага атмасфернага ціску, таму будзе пераважна без ападкаў, па начах стане падмарожваць, але дзённыя тэмпературы застануцца плюсавыя. Сёння ўдзень будзе месцамі сонечна і адносна цёпла — ад плюс 1 градуса да 6 цяпла.

Заўтра таксама будзе пераважна без ападкаў. Месцамі магчымы туман, уначы і раніцай слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад мінус 4 градусаў да плюс 1 градуса, удзень — ад нуля да 5 цяпла. Не будзе істотных змен і ў нядзелю, толькі раніцай і ўдзень месцамі па паўночным захадзе пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах магчымыя туман і слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 марозу да 2 цяпла, удзень чакаецца мінус 1 — плюс 5 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак толькі месцамі па поўначы краіны магчымы мокры снег і дождж. У асобных раёнах прагназуюцца слабыя туман і галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 5 марозу да 2 цяпла, удзень будзе ад мінус 2 да 4 градусаў цяпла.

Дарэчы, сталічныя сіноптыкі адзначаюць, што хрышчэнскія маразы бываюць не заўсёды. У Мінску самая халодная ноч на Вадохрышча была ў 1968 годзе, тады тэмпература паветра паніжалася да мінус 25,8 градуса. А самым цёплым Вадохрышча было ў 2007 годзе, калі ўначы тэмпература была да плюс 1 градуса, а ўдзень дасягала 8,1 цяпла. А сёлета мы паб'ем гэты рэкорд?

Сяргей КУРКАЧ.

А не шкодзь!

80 СЕТАК ДАЎЖЫНЁЙ ЧАТЫРЫ КІЛАМЕТРЫ

Іх канфіскавалі з пачатку года. Большасць — яшчэ да пападання ў вадаёмы, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Частка забароненых прылад лоўлі была здадзена добраахвотна. Жыхар Рэчыцкага раёна перадаў супрацоўнікам гомельскай інспекцыі 11 сетак даўжынёй 745 метраў, якія ён захоўваў у гаспадарчай пабудове, размешчанай паблізу Дняпра. Выкарыстоўваў іх для браканьерства альбо не — пытанне рытарычнае. Але добраахвотная выдача пазбавіла яго і ад спакусы выйсці на нелегальны промысел, і ад штрафу за незаконнае захоўванне сеткаматэрыялаў.

Жанчына з Брагінскага раёна таксама паведаміла ў мясцовую інспекцыю аб жаданні здаць «арсенал», які застаўся ад мужа, — дзесяць сетак даўжынёй 342 метры і сем нератаў саматужнага вырабу.

А вось маладога чалавека з вёскі Суйкава Віцебскага раёна, якому ледзь споўнілася 18 гадоў, інспектарам давялося доўга пераконваць расстацца з забароненымі прыладамі. У інспекцыю паступіла інфармацыя, што яго бачылі на мясцовых вадаёмах з сеткамі. Не губляючы часу, інспектары прыйшлі дадому на размову з юным браканьерам і яго маці. Першапачаткова абодва адмаўлялі наяўнасць у доме забароненых прылад, але, усвядоміўшы наступствы, юнак усё ж неахвотна выцягнуў з розных схованак 14 сетак агульнай даўжынёй 613 метраў. Маладога чалавека прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці за іх захоўванне, хоць у такой сітуацыі штраф можа быць мінімальны.

А вось прадпрымальніцы з аграгарадка Доўск Рагачоўскага раёна пагражае штраф ад 10 да 200 базавых велічынь. Жанчына легальна прадавала землякам рыбалоўныя снасці, а нелегальна — сеткі. Пад выглядам пакупнікоў да яе наведаліся супрацоўнікі гомельскай інспекцыі. У выніку канфіскавана 6 новых сетак агульнай даўжынёй амаль 600 метраў, складзены адміністрацыйны пратакол.

У Дзяржінспекцыі нагадваюць, што незаконныя выраб, набыццё, захоўванне або збыт рыбалоўных сетак і сеткаматэрыялаў цягнуць накладанне штрафу: на фізасобу — да 50 базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — да 200 базавых велічынь, на юрыдычную асобу — да 500 базавых велічынь.

Добраахвотна здаць забароненыя прылады лоўлі рыбы можна, звярнуўшыся ў любое тэрытарыяльнае падраздзяленне Дзяржінспекцыі. У такім выпадку заяўнікі будуць вызвалены ад адказнасці за іх незаконнае захоўванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Жыллё

СЁЛЕТА ПАБУДУЮЦЬ ДА ЧАТЫРОХ МІЛЬЁНАЎ КВАДРАТНЫХ МЕТРАЎ ЖЫЛЛЯ

З іх каля 20 дзевяціпавярховых дамоў — з электраацяпленнем

Ужо некалькі гадоў запар у планах па будаўніцтве жылля фігуруе адна лічба — 4 мільёны «квадратаў», але ёсць і змены. Гэта павелічэнне яго агульнай плошчы, якое ўзводзіцца для шматдзетных сем'яў, актывізацыя работ у гарадах-спадарожніках і будаўніцтва дамоў з электрычным ацяпленнем і падагрэвам вады.

Днямі ўрад зацвердзіў аб'ёмы будаўніцтва жылля ў нашай краіне ў 2020—2021 гадах. Усяго сёлета для тых, хто будуецца з дзяржпадтрымкай, прадугледжана будаўніцтва 984,13 тысячы квадратных метраў жылля. Агульны план на 2020 год для Мінскай вобласці — 1,12 мільёна «квадратаў», Брэсцкай — 650 тысяч, Мінска — 630 тысяч, Гомельскай вобласці — 485 тысяч, Гродзенскай вобласці — 415 тысяч, Магілёўскай — 365 тысяч, Віцебскай — 335 тысяч квадратных метраў.

Відавочна, галоўнай навіной сёлета стануць упершыню прапісаныя планы па ўводзе дамоў з электрычным ацяпленнем і падагрэвам вады. Такога жылля павінны пабудаваць 135 тысяч квадратных метраў. Таму ў кожнай вобласці і Мінску трэба забяспечыць будаўніцтва шматкватэрных дамоў, дзе электраэнергія выкарыстоўваецца для мэт ацяплення, гарачага водазабеспячэння і прыгатавання ежы. Калі выказаць здагадку, што «электрадамы» будуць выкананы ў стандартным дзевяціпавярховым варыянце, то ўзвесці трэба каля 20 такіх аб'ектаў.

Арэнднага жылля ў краіне пабудуюць 135 тысяч «квадратаў», пры гэтым больш за ўсё ў Мінскай вобласці — 30,5 тысячы метраў — і Мінску — 22,3 тысячы.

У гарадах-спадарожніках плануецца ўзвесці жыллё амаль для тысячы чалавек. Недзе палова з іх атрымае кватэры ў Смалявічах. Па 100 чалавек палепшаць жыллёвыя ўмовы ў Жабінцы і Фаніпалі, крыху менш за сотню — у Лагойску, 80 — у Дзяржынску, 60 — у Скідзелі, 58 — у Рудзенску і 10 — у Заслаўі.

Сяргей КУРКАЧ.

Спажывец

«СМАК» ВЯСНЫ

Ці карысныя зімовыя памідоры і агуркі?

Нядаўна знаёмая, якая пераехала жыць у вёску, выставіла фота ў «Інстаграме»: як у яе ў садзе прараслі цюльпаны. Я разглядала фатаграфію і думала, што зіма выйшла сёлета нейкая нягеглая, і каб не выразаныя з паперы снежынкі на акне, то можна было б яе і не заўважыць... І так адразу захацелася свежай зеляніны, хрусткіх агуркоў, мясістых духмяных памідораў... Я кінулася на рынак, але мой запал тут жа згас.

Не, вядома, там былі духмяныя азербайджанскія памідоры па 35 рублёў і пухірыстыя маленькія агурочкі з поўдня Расіі па 16 рублёў, але змесціва майго кашалька паказвала на тое, што не пакаштаваць мне гэтай апетытнай агародніны. І я накіравалася далей — у пошуку памідораў і агуркоў больш танных. Хадзіла, разглядаючы агародніну і садавіну, паміж гандлёвымі радамі, нібыта падарожнічала па зямным шары: Іспанія, Турцыя, Нідэрланды... Пакуль не «вярнулася» на беларускія прасторы, дзе нашы памідоры можна было набыць за 3,5 рубля, а агуркі прыкладна за 5 рублёў. Але яны выглядалі не так апетытна, як іх паўднёвыя браты...

— Канешне, нашы памідоры і агуркі не такія па колеры і водары, як вырашчаныя пад паўднёвым сонцам, але не хвалюйцеся — па складзе бялкоў, вугляводаў і мікраэлементаў яны не саступаюць летняй агародніне, — тлумачыць **спецыяліст па рабоце з кліентамі фермерскай гаспадаркі «АграЛайнПлюс» Аляксандра НАВАДВОРСКАЯ.** — Летам нашы памідоры і агуркі такія ж яркія, салодкія, духмяныя і насычаныя, як агародніна з поўдня. А вось зімой на нашы таматы падае попыт, таму фермеры вырошчваюць іх у невялікіх аб'ёмах.

Міф пра тое, што зімовая агародніна не такая карысная, як летняя, развеялі ў Навукова-практычным цэнтры па харчаванні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

— Агуркі і памідоры ўвесь год вырошчваюць у аднолькавых цяплічных умовах, як правіла, на спецыяльных субстратах, з выкарыстаннем пажыўных палівальных сумесяў, таму па карыснасці такая агародніна не адрозніваецца, — запэўнівае **начальнік рэспубліканскага кантрольна-выпрабавальнага комплексу па якасці і бяспецы прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдат сельскагаспадарчых навук Ірына ПАЧЫЦКАЯ.** — Пры гэтым, як правіла, для падаўжэння тэрмінаў захоўвання агародніны яе здымаюць да поўнага выспявання, таму яна не паспявае назапасіць у сабе ўласцівыя ёй водар і смак.

Як сцвярджае спецыяліст, зімовая агародніна, прывезеная з Іспаніі, Турцыі і іншых паўднёвых краін, па якасці супастаўная з агароднінай, што расла ў нас.

Бывае, плады, вырашчаныя ў цяплейшых умовах, больш духмяныя і салодкія. Але на рынку турэцкія памідоры ўсё роўна здаліся мне менш апетытныя, чым беларускія. Аказалася, што вялікую ролю адыгрываюць тэрміны здымання і ўмовы даспявання. Калі агародніна спее ў працэсе транспарціроўкі і захоўвання, то, як правіла, яна мае нізкія смакавыя характарыстыкі.

Некаторыя мае знаёмыя называюць зімовую агародніну «нітратнай», але насамрэч па вонкавым выглядзе або паху немагчыма вызначыць наяўнасць нітратаў, яны незаўважныя. Спецыялісты вызначаюць іх утрыманне з дапамогай спецыяльнага прыбора — нітратамера.

— Нітраты — солі азотнай кіслаты, добра растваральныя ў вадзе, прыродныя злучэнні, якія трапляюць у расліны з глебы (субстрату) або палівальных сумесяў, неабходныя для росту і развіцця расліны, — расказвае Ірына Пачыцкая. — Пры пэўных умовах гэтыя злучэнні могуць назапашвацца ў расліне і без унясення высокіх доз угнаенняў. Утрыманне нітратаў у агародніне залежыць ад мноства розных фактараў: гэта біялагічныя і сартавыя асаблівасці раслін, узровень урадлівасці глебы, тэмпература і вільготнасць глебы і паветра, інтэнсіўнасць і працягласць асвятлення, тэхналогія вырошчвання. Шкоднасць нітратаў заключаецца ў тым, што пры пэўных умовах у арганізме чалавека яны могуць пераходзіць у нітрыты, якія ўступаюць у хімічную рэакцыю з гемаглабінам крыві, утвараючы атрутныя злучэнні.

Увогуле на кожны від агародніны і садавіны існуюць нарматыўныя дакументы, якія рэгламентуюць патрабаванні да арганалептычных паказчыкаў (знешні выгляд, смак, водар, кансістэнцыя і іншыя), фізіка-хімічных паказчыкаў (памер, наяўнасць прымесяў) і абавязкова да паказчыкаў бяспекі (утрыманне таксічных элементаў, радыенуклідаў, пестыцыдаў, нітратаў). Каб не набыць небяспечную агародніну на рынку, лепей папрасіць у прадаўца заключэнне аб санітарна-ветэрынарным кантролі.

Увогуле, паводле рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штодня трэба з'ядаць 0,5 кілаграма агародніны і садавіны. Яны могуць быць свежыя ці замарожаныя, прыгатаваныя рознымі спосабамі. Напрыклад, тамат багаты разнастайнымі вітамінамі, а таксама мінераламі, фруктозай і клятчаткай, у яго склад уваходзяць ёд, магній, жалеза і цынк, карысць якіх для арганізма даказаная даўно. Ужыванне памідораў у ежу станоўча адбіваецца на стане арганізма чалавека, у прыватнасці, дыетолагі рэкамендуюць есці іх людзям з лішняй вагой, бо ў ста грамах гэтай агародніны змяшчаецца ўсяго 19 кілакалорый. Антыаксідант, які ўтрымліваюць у сваім саставе памідоры, абараняе арганізм ад анкалагічных захворванняў.

У саставе ж агуркоў — у асноўным вада. Аднак акрамя яе ў «пухірыстых» ёсць вітаміны і мінералы — A, B, C, PP, E, K, кальцый, фосфар, магній, жалеза, натрый, хром, хлор, цырконій, марганец, нікель, крэмній, калій. У 100 грамах агурка змяшчаецца ўсяго 15 кілакалорый, а дыетолагі адзначаюць, што яны спрыяюць лепшаму засваенню бялка.

...Дома я нарэзала свежую зімовую агародніну, набытую на рынку, у надзеі адчуць вясенне-летні водар. Але, на жаль, не атрымалася. Усё ж карысць карысцю, але смакавыя якасці ніхто не адмяняў. Эх, хутчэй бы лета!..

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Неасабісты суб'ектыў

Час зачыненых дзвярэй

Нетыповы роздум пасля гучных судовых спраў

ПАСЛЯ таго як быў вынесены прысуд забойцам настаўніцы з Чэрыкава, мы з калегамі доўга абмяркоўвалі гэту тэму. Прыгадалі яшчэ адзін таксама сёлетні суд па не менш рэзананснай справе — забойцы з Юравіч атрымалі вялікія тэрміны зняволення. Я сама пасля дзівілася, як мы выйшлі ў сваёй размове на нетыповы ракурс. Бо гаварылі не пра смяротнае пакаранне, не пра тое, што рухала маладымі злачынцамі ў іх страшнай справе, — пра гэта ў каментарыях у сеціве не разважаў, здаецца, толькі лянівы, і ўсе такія філантропы, такія філосафы. Мы ж зачапілі тэму больш прыземленую: чаму падобныя страшныя злачынствы, дзякаваць богу, рэдкія, адбываюцца ў большасці сваёй у сельскай мясцовасці або ў прыватным сектары?

Сапраўды, яднае дзве вышэйназваныя крымінальныя гісторыі не толькі гібель людзей, не толькі малады ўзрост злачынцаў, але і гэта сухая пратакольная фраза: «Падсудныя пранікліў дом пацярпелых...» Вы часта сустракалі падобную фармулёўку ў зводках, якія датычацца гарадскіх кватэр у шматпавярховых дамах? Хіба што з працягам кшталту «шляхам узлому», праўда? У дом, які стаіць асобна, трапіць ліхім людзям нашмат лягчэй. А яшчэ, каб схаваць сляды злачынства, яго і падпаліць — як зрабілі недавяркі ў Чэрыкаве, як часта пачалі рабіць нават дробныя зладзеі, якія нікога не чапаюць, проста выносяць маёмасць ці грошы. І зноў — гэта толькі пра вёску ці пра прыватны сектар.

І мне здаецца, справа не толькі ў тым, што будынак, які стаіць асобна, ад пачатку больш уразлівы для зламыснікаў. Тут больш пра тое, як мы самі адносімся да абароненасці гэтага асобнага жытла. Дакладней — нават да самой неабходнасці той абароненасці. Бо яна — абсалютна новае паняцце ў жыцці традыцыйнага беларускага грамадства. Ну не было ў нас такой традыцыі — замыкаць на некалькі замкоў дзверы вясковай хаты і абносіць двор трывалым высокім плотам. Хаты нашы бацькі і іх бацькі замыкалі рэдка — толькі з'язджаючы кудысьці надоўга, за якой патрэбай у райцэнтр ці на далёкі сенакос. Калі ж выходзілі кудысьці паблізу — які замок? Клямка, злёгку накінутая на прабой, прыхілены да дзвярэй кіёк — проста як знак таму, хто ідзе ў хату, што гаспадароў няма дома. (І як знак непарушнай упэўненасці, што той, хто ідзе, проста развернецца і пойдзе назад.) А нашы традыцыйныя платы? Невысокія негустыя штыкеціны хіба што абаранялі ад скаціны, якую гналі па вуліцы, а пералезці праз такі плот пры жаданні можа нават дзіця. Брамкі калі і зачыняюцца, дык на не вельмі трывалую засаўку або на звычайны кручок. А як нашы хаты замыкаюцца нанач? У сваю, напрыклад, я, вяртаючыся з начных пагулянак, трапляла з дапамогай... сярпа, прасоўваючы яго ў шчыліну паміж дзвярыма і вушаком і падымаючы ім крук — з выгляду трывалы, але ў якасці запора вельмі ненадзейны.

Чаму яно так у нас спрадвеку склалася? Можа, таму, што, як казала мая бабка, не было чаго красці? Можа, людзі былі больш сумленныя і не думалі пра тое, што можна зайсці без дазволу, узяць чужое, нашкодзіць гаспадару? Нездарма ж Караткевіч пісаў пра нас «Край адкрытых душ і дзвярэй», маючы на ўвазе, што другое вынікае з першага.

ПРАЎДА, Караткевіч пісаў тое трыццаць восем гадоў таму. Шмат што змянілася з таго часу — новы лад, новая краіна, новыя рэаліі, у тым ліку і ў невялікіх паселішчах. Гадоў дваццаць назад, калі наша суседка, пераехаўшы з горада ў вёску, пачала «маштабную рэканструкцыю» і без таго дагледжанай сядзібы, усе глядзелі на яе як на дзівачку: навошта мяняць вокны, агароджваць шчыльным плотам участак, рабіць жалезную брамку з запорам, які адмыкаецца толькі з двара? Цяпер разумееш, як правільна яна зрабіла. І ўсё больш па вёсцы высокіх металічных платоў, дыхтоўных вокнаў (на некаторых нават краты фігурныя), і мы замест драўлянага плота нацягнулі сетку, а на новых брамках прадугледжаныя нават вушкі для навяснога замка (праўда, вешаем яго толькі з адной прычыны — каб дзеці з двара на праезную частку не выбягалі).

Карацей, вучымся жыць па-новаму, баронячы сябе і сваю маёмасць. Вучымся пакрысе, неахвотна — не дае хутчэй рабіць гэта генная памяць не аднаго вясковага пакалення. Пэўна, з-за яе, з-за гэтай памяці, забываемся зачыняцца на замок, без сумненняў адчыняем дзверы знаёмаму, які ў іх пастукае, не асабліва задумваючыся, што ў яго ў думках. За гэта, здараецца, вельмі дорага расплачваемся — нажытым дабром, а здараецца, і жыццём. Бо сёння ўсюды, нават у нашым «краі адкрытых душ і дзвярэй», настаў час дзвярэй зачыненых. І да гэтага трэба прывыкаць, і з гэтым трэба жыць.

ЗРЭШТЫ, з дзвярыма неяк разбяромся. Галоўнае, каб з душамі нічога не змянілася.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.



У ТОЙ СТЭП... ЦІ НЕ Ў ТОЙ?

...Не сказаць, што Зміцер з Міколам былі сябрамі. Ды і жылі яны зусім не ў суседстве — ад дома да дома (хоць вёска і адна) недзе з паўкіламетра. Але ж лёс часам зводзіў: то дапамагчы адзін аднаму, то параіцца, то штось абмеркаваць.

Гэтым разам, у цёплы летні вечар, мужчыны проста так запыніліся ля Змітравай хаты, пасядзелі на лавачцы, кульнулі па чарцы-другой. Глядзіш — і настрой прыўзняўся: гаспадар дык нават запеў — сваю любімую «По диким степям Забайкалья...». Ён некалі служыў там, а значыць, было што ўзгадаць.

Факт, што Мікола яго песню ўважліва слухаў, спрабаваў падцягваць, а потым успомніў, што можа і падыграць: гармонік мае!

— Пачакай, я мігам... Зараз прынясу! — паабяцаў ён і ледзь не подбегам кінуўся дахаты.

Тут трэба сказаць, што інструмент дастаўся Міколу ў спадчыну. Бацька яго быў знаны гарманіст, а вось сын — не. Ён добра іграў толькі адну мелодыю — да песні «Кацюша».

Вось і цяпер хуценька вярнуўся, прысеў да Міколы на лаўку, расцягнуў мяхі гармоніка і загадаў: «Пачынай!»

Зміцер паслухмяна зацягнуў: «По ди-и-и-ким сте-пям Забайкалья, где з-о-о-ло-о-о-то роют в горах...» Мікола зайграў «Кацюшу». І так «сугучна» ў іх атрымалася, што ўсё наваколле сціхла — гэтак іх слухала!..

Дзядзькам захацелася паўтарыць. Потым яшчэ і яшчэ.

— Артысты, — гаварылі пра іх адны суседзі.

— ...пагарэлага тэатра, — дадавалі другія.

Зміцер з Міколам толькі ўсміхаліся, бо помнілі, як жа хораша тады і пасядзелі, і паспявалі.

Ала Альфер,

г. Беразіно.

ВОЧКІ ГЛЯДЗЯЦЬ, ДЫ ТРАСЦЫ З'ЯДЗЯЦЬ...

Лёшка ў свае няпоўныя трыццаць паспеў і ажаніцца, і дзяцей нажыць, і развесціся, бо жонка ў яго была, як тая абгортка ад цукеркі — яркая і пустая: ні табе нешта зварыць, ні прыбраць, ні дзяцей дагледзець. Усё трэба самому. І ён цягнуў: калі цвярозы — ніякіх прэтэнзій. А вось калі выпіваў — дах часам зносіла падчыстую: усчынаўся «разбор палётаў»...

Аднойчы — пасля чарговага з іх — яго палавіна вылецела з хаты і «знікла за гарызонтам», пакінуўшы мужу свае няхітрыя нажыткі ды дваіх дзяцей...

Маці-адзіночкам з імі нялёгка, а ўжо пра бацьку і казаць няма чаго! Таму Лёшка быў заклапочаны. Ён шукаў: сабе — жонку, дзецям — матулю, дому — сапраўдную гаспадыню.

Замнога, мусіць, хацеў, бо доўга не знаходзіў нікога, але ж тут у калгас, дзе ён працаваў механізатарам, прыслалі новую брыгадзірку. Той факт, што дзяўчына маладзенькая, яшчцём не бітая, да ролі маці дваіх дзяцей не гатовая, Лёшку не бянтэжыў. Для яго — невысокага і шчуплага — перашкодай не быў нават рост абранніцы-баскетбалісткі. Ён стаў, што называецца, падбіваць кліны.

— Пара, пара табе замуж, — ледзь не штодня казаў ёй Лёша.

Аднак Вера (так звалі брыгадзірку) альбо не зважала ці адмахвалася, альбо ўсё пераводзіла на жарт. Толькі той раз як быццам «згадзілася», уздыхнула:

— Пара то пара — але як тут пойдзеш, калі ніхто не бярэ?

— Як гэта ніхто?! — аж падскочыў залётнік. — А я?

— Дык ты — гэта несур'ёзна...

— Яшчэ і як сур'ёзна! — усклікнуў Аляксей. — Я хоць сёння гатоў!

— Ну, калі так, — тады іншая рэч, — засмяялася дзяўчына. А больш нічога сказаць не паспела: паклікаў старшыня.

Лёшка пачухаў патыліцу:

— Як думаеш, сёння ў сваты пайсці, — спытаў у сябра Паўліка, — ці суботы пачакаць?

— А навошта цягнуць? — адказаў той. — Тут на тваю Верку адзін рокер вока паклаў. У суботу, чаго добрага, на танцы прыедзе, потым пасадзіць дзеўку на свой драндулет, пакатае і пішы прапала.

— Дык што рабіць? — разгубіўся жаніх.

— Што-што — дзейнічаць!

Праз паўгадзіны каля дома, у якім калгас выдзеліў жыллё маладой брыгадзірцы, спыніўся трактар, трое мужчын сталі выносіць і грузіць на прычэп яе рэчы. (Якім чынам дзверы адамкнулі, гісторыя замоўчвае.)

— Верачка некуды з'язджае? — спытала іх старэнькая суседка.

— Не хвалюйся, бабуля, — зусім недалёка, — весела сказаў адзін з тых «грузчыкаў». — На другую вуліцу... Замуж яна выходзіць.

— У аўторак? — здзівілася жанчына. — А за каго?

— Сакрэт! На сяло заўтра сходзіш — даведаешся.

На гэтым слове трактар выпусціў клуб чорнага дыму і рвануў з падворка.

А вечарам Вера прыйшла дамоў і ледзь не самлела: у кватэры засталіся толькі шафа (дзякуй богу, з адзеннем), газавая пліта і адна табурэтка... Нават фікус знеслі! Сярод белага дня! На ажыўленай вуліцы!..

У роспачы дзеўка пабегла да суседзяў і хутка з іх дапамогай напала на след: ледзь пераступіўшы парог Алёшавай хаты, тут жа ўбачыла свой дыван, свой тэлевізар і фікус на этажэрцы.

— Я ж казаў, што намеры ў мяне самыя сур'ёзныя, — з ахвотай патлумачыў гаспадар, які на Верынай патэльні ўжо смажыў яешню. — А шафу мы заўтра забяром.

...Праўду кажуць, паспех — на смех: бабуля Волька, у якой была бяссонніца, ноччу ўбачыла, як да дома брыгадзіркі пад'ехаў грузавік і як іншыя ўжо мужчыны разам з гаспадыняй сталі згружаць з яго рэчы, пагружаныя ўдзень.

Алена Несцяронак,

г. Докшыцы.

«ШЫЦЦЁ — ЯНО СУПАКОЙВАЕ...»

Спадабацца новай супрацоўніцы хацелі многія хлопцы, Шурык — не выключэнне. У тую раніцу ён выцягнуў з шафы новыя джынсы, хацеў быў надзець, але «заблытаўся» ў доўгіх калошах.

— Ты што — зноў не ўкараціла? — абурана спытаў сястру.

— Ды ў галаве мне твае джынсы, — адмахнулася тая. — Забылася...

— Але ж я прасіў...

— А не трэба было прасіць, — абарвала яго Алена. — Лепш паклаў бы на віднае месца, я з работы прыйшла б, убачыла і зрабіла... А зараз — прабач — мне пара.

На гэтым сястра крутнулася перад люстэркам і выскачыла з кватэры.

Заклапочаны Шурык на нейкі час застаўся адзін: зайшоў да яе ў пакой, паглядзеў па баках і ўверх — закінуў свае джынсы на... люстру. Вось тут — думае — сястра дакладна ўбачыць!

Так яно ў прынцыпе і выйшла. Адно што...

Прамокшы пад халодным восеньскім дажджом, дзяўчына цямком уляцела ў вітальню і там жа... села: са столі ў яе пакоі звісалі нейчыя ногі!?

...Толькі потым, крыху ачуняўшы і ўключыўшы святло, яна ўбачыла, што памылілася, што там — проста Шуркавы джынсы.

— Я іх укарачу... Так укарачу, — навек запомніш! — паабяцала яна брату.

Але ж потым павячэрала, уключыла тэлевізар, выцягнула швейную машынку...

Шыццё — яно і сапраўды супакойвае... Нават моцна «ўзнятыя» нервы.

Галіна Нечыпаровіч,

в. Магільна, Уздзенскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

АД ЯЕ Ж абяцаныя вынікі конкурсу на найлепшыя вясёлыя і праўдзівыя гісторыі, змешчаныя ў газеце «Звязда» ў 2019 годзе.

ПРАЎДА, ГУМАР І ТРОШКІ ФАНТАЗІІ,

альбо Конкурс скончыўся? Конкурс працягваецца!

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10–329, в раб. дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **29 января 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о продаже имущества государственного предприятия «Щучинская МПМК-166» было опубликовано в газете «Звязда» от 05.11.2019

Калядкі, калядачкі



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **1.** «Хай ... родзіць, хай чарка ходзіць». З пажадання калядоўшчыкаў гаспадарам хаты. **5.** Сумесь хваёвай смалы з пахучымі рэчывамі. **9.** Шматгадовы палярны лёд. **11.** Зношаны абутак. **12.** Зімой ... качаецца — чакай адлігі (прыкм.). **13.** Тая, хто выражае якую-небудзь ідэю. **14.** Знак Задыяка. **16.** «... на куццю — грыбы на лета, // Такая матчына прымета». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Каляды»). **18.** Цвёрды мінерал. **19.** ... у вушах летам — к непагадзі, зімою — к снегападу (прыкм.). **22.** Старажытнаегіпецкі свяшчэнны бык. **23.** Заходні вецер на Васілле (14 студзеня) абяцае мокрае ..., паўночны — халоднае ... з градам (прыкм.). **24.** «... дзетвары // Дорыць добры дзед стары». З верша Л. Пранчака «Калядкі». **30.** Прывезеныя тавары (разм.). **31.** Травінка. **32.** Для мядзведзя зіма — адна ... (прык.). **33.** ... каркаюць чарадой — на марознае надвор'е (прыкм.). **34.** Ветраны млын.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **2.** Ледзяны ... на акне; малюнак мароза-мастака. **3.** «Калядкі, Калядачкі — ... ды аладачкі». З каляднай песні. **4.** Сонца на лета — зіма на ... (прык.). **6.** Студзень — ... ясных зорак, белых сняжынак, сініх льдоў (прык.). **7.** Што ..., то абычай (прык.). **8.** Снег, які толькі што выпаў. **10.** Зімовая ... — запамога (прык.). **15.** «Ой, ..., ладкі, // Надышлі Калядкі». З верша А. Вольскага «Калядкі». **17.** Якое ... пасля Раства (7 студзеня), такое будзе і пасля Пятрова дня (12 ліпеня; прыкм.). **20.** Прадмет мяккай мэблі. **21.** Абледзянелая скарынка на паверхні снегу. **25.** «Калядзін, калядзін, // Я ў бацькі ... . // Караценькі кажушок. // Дайце мне піражок». З каляднай песні. **26.** Востры кій (устар.). **27.** Неад'емная страва на святочную калядную вячэру. **28.** «Дзе каза рогам — // Там ... стогам». З каляднай песні. **29.** ..., як казна, сваё возьме (прык.).

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

Праверце, калі ласка, адказы:
Па гарызанталі: 1. Бульба. 5. Смолка. 9. Пак. 11. Апоркі. 12. Сабака. 13. Выразніца. 14. Шалі. 16. Снег. 18. Апал. 19. Звон. 22. Апіс. 23. Лета. 24. Падарункі. 30. Прывоз. 31. Цявіна. 32. Ноч. 33. Вароны. 34. Вятрак.
Па вертыкалі: 2. Узор. 3. Бліны. 4. Мароз. 6. Месяц. 7. Край. 8. Пароша. 10. Дарога. 15. Ладачкі. 17. Надвор'е. 20. Канапа. 21. Шарпак. 25. Адзін. 26. Ражон. 27. Куцця. 28. Жыта. 29. Зіма.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.19	17.21	8.02
Віцебск —	9.14	17.04	7.50
Магілёў —	9.09	17.11	8.02
Гомель —	8.58	17.15	8.17
Гродна —	9.33	17.38	8.05
Брэст —	9.26	17.45	8.19

Месяц

Апошняя квадра ў 15.58. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Архіпа, Арцёма, Лукі, Марка, Сцяпана.*
К. *Антаніны, Антона, Генрыха, Мар'яна, Юльяна, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

17 СТУДЗЕНЯ

1765 год — нарадзіўся Ігнат Антонавіч Манькоўскі, беларускі публіцыст. З 1783 года быў на дзяржаўнай службе: саветнік Беларускага губернскага праўлення, віцебскі губернскі пракурор, віцэ-губернатар. З 1817-га ў адстаўцы, жыў у сваім маёнтку Мілае каля Віцебска. Публікаваўся ў рускіх часопісах. У «Пісьме з Віцебска» асуджаў агрэсію Напалеона, ухваляў гістарычны подзвіг народаў Расіі ў вайне 1812 года. Мяркуецца, што пісаў і на беларускай мове, некаторыя даследчыкі лічаць яго аўтарам «Энеіды навыварат».



1915 год — нарадзіўся Антон Стафанавіч Бархаткоў, беларускі жывапісец, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Вучань і прадаўжальнік традыцый Бялыніцкага-Бірулі. Аўтар шырока вядомых карцін «Ганачак», «Першая песенька», «Поўдзень на сенакосе», «Вясна на Нёмане», «Красавіцкі дзень», «Вясна», «Любімыя дубы Я. Коласа. Мікалаеўшчына», «Ветраны дзень на возеры Мсціна». Творы захоўваюцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, музеях Магілёва, Гродна, Гомеля, Бялыніч, Касцюковіч, Траццякоўскай галерэі ў Маскве і іншых.

1930 год — нарадзіўся Леанід Канстанцінавіч Лукша, беларускі вучоны ў галіне мостабудаўніцтва, доктар тэхнічных навук (1981), прафесар (1985), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1990). Аўтар навуковых прац па надзейнасці будаўнічых канструкцый, супраціве матэрыялаў.

1377 год — папскі прастол вярнуўся ў Рым. Гэта было адзначана ўрачыстым уездам у горад Папы Грыгорыя XI, які пакінуў ранейшае месца ў Авіньёне ў верасні папярэдняга года.

1600 год — нарадзіўся Педра Кальдэрон дэ ла Барка, іспанскі драматург і паэт, чые творы лічацца адным з найвышэйшых дасягненняў літаратуры «залатога стагоддзя».

1700 год — расійскі цар Пётр I загадаў галіць бароды і адзявацца на еўрапейскі манер.

1945 год — нарадзіўся Сямён Тэадоравіч Альтаў, расійскі пісьменнік-сатырык, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі.

1960 год — нарадзіўся Ігар Юр'евіч Нікалаеў, расійскі кампазітар, спявак, паэт, прадзюсар, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі. Уладальнік шматлікіх прэстыжных расійскіх музычных прэмій.

УСМІХНЕМСЯ

Жонка — мужу:
— Ты мяне ніколі не разумееш!
— Ды як жа мне цябе разумець, калі ты толькі што выскубла свае бровы, а цяпер стаіш перад люстэркам і малюеш новыя?!

— Я купіў машыну і цяпер люблю дождж!
— Чаму?
— Няма патрэбы ездзіць на мыйку.

Жаночае сяброўства слабейшае за мужчынскае прыблізна на 40 градусаў.

— Навошта людзі ў фэйсбуку пішуць свае імёны на англійскай?
— Каб палегчыць жыццё сваім шматлікім замежным фанатам.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 87.
Нумар падпісаны ў 19.30 16 студзеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

17 студзеня 2020 г. № 2 (538)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Усе заканадаўчыя змены дыктуе жыццё

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА наведала ААТ «Кандытарская фабрыка «Слодыч»

СПІКЕР верхняй палаты парламента пазнаёмілася з асноўнымі паказчыкамі прадпрыемства, яго вытворчасцю, сустрэлася з працоўным калектывам і адказала на ўзніклыя пытанні. Такая актыўная форма работы ў межах адзіных інфармацыйных дзён дае свой плён. І вось чаму.

Лідар рынку

Старшыня Савета Рэспублікі з'яўляецца ўпаўнаважанай па Мінску, таму яе ўвага да работы сталічных прадпрыемстваў зразумелая. Тым больш што на гэтую кандытарскую фабрыку яна трапіла ўпершыню. Нагадаем, што тут вырабляюць печыва на ўсе ўзросты і любы густ. Зараз «Слодыч» лічыцца лідарам беларускага рынку печыва і кандытарскіх вырабаў з мукі: тут пякуць больш за 100 відаў печыва, а прадукцыя фабрыкі займае 24 % айчыннага рынку гэтай прадукцыі. Ёсць і экспарт, які за тры леташнія кварталы склаў 1,5 мільёна долараў, паведаміў **намеснік дырэктара па камерцыйнай дзейнасці Сяргей ТРЫБОЙ.** Дзе ўпадабалі беларускае печыва? У 18 краінах свету (большай часткай у Расіі), сярод спажыўцоў ёсць нават В'етнам і ЗША.

Працуюць на прадпрыемстве галоўным чынам жанчыны — іх з больш чым 500 чалавек працоўнага калектыву прадпрыемства 68 %. Што і не дзіўна: смачная выпечка — справа пяшчотных жаночых рук.

стар. 2

ТЭМА ТЫДНЯ

РЭЗЕРВЫ «МЯСЦОВАЙ СКАРБОНКІ»

Карэспандэнт «МС» высвятляла на прыкладзе Чавускага раёна, як тут зарабляюць на сваё развіццё

Ад Магілёва да Чавус гадзіна язды на аўтобусе, на асабістым транспарце можна «даляцець» і хутчэй. Утульны гарадок з дастаткова добра развітай інфраструктурай, ёсць рака, чыгунка — што яшчэ трэба для стабільнага жыцця? Але без датацый справа ўсё роўна не абыходзіцца. Няма буйных вытворчасцяў, а значыць, і актыўных паступленняў у бюджэт. Ці лёгка сёння напаўняць «мясцовую скарбонку» і як развівацца, калі грошай не хапае, — на гэтую тэму паразважаў старшыня Чавускага райсавета, кіраўнік Магілёўскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.

Фота дадзена Чавускім райсаветам.

Прэзідэнтам краіны пастаўлена задача да 2025 года павялічыць ВУП да 100 мільярдаў долараў. І без павелічэння выручкі на аднаго работніка, пошуку новых відаў прадукцыі, адкрыцця новых вытворчасцяў тут не абысціся. Для гэтага трэба актыўна працаваць, уцягваць у абарот нявыкарыстаную маёмасць, шукаць спосабы прыцягнуць грошы ў бюджэт. У Чавускім раёне робяць стаўку на развіццё сельскай і лясной гаспадаркі.

— У нас ёсць прыдатныя пляцоўкі, але пакуль, на жаль, няма праектаў, якія б сур'ёзна паўплывалі на становішча. Ёсць патэнцыйныя інвестары, але яны яшчэ прыглядаюцца, вывучаюць попыт. Напрыклад, ТАА «Саўэкспарт» наладжвае ў раёне вытворчасць гофракардону, — удакладняе Анатоль Мацюлін.

Сёння вітаюцца альтэрнатыўныя спосабы прыцягнення грошай у бюджэт. І ў гэтым вялікія надзеі ўскладаюцца на актыўную частку мясцовага насельніцтва.

стар. 14

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Патрэбная дапамога

Сенатары бяруць шэфства над РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі. стар. 3

Не побач, а разам

Пра што ішла гаворка на сустрэчы парламентарыяў са старшынёй Мінаблвыканкама. стар. 4

Жыць па сродках

Пра некаторыя асаблівасці рэспубліканскага бюджэту, накіраваныя на забеспячэнне збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. стар. 13

«Бамбілы» наступаюць

Нядобрасумленная канкурэнцыя ў пасажырскіх перавозках вядзе да страт і банкруцтва... стар. 4

Гаспадарскі падыход



Як на Брэстчыне жыве сельсавет памерам у адну вёску? стар. 15

Усе заканадаўчыя змены дыктуе жыццё

Трыадзіная задача

Што сёння хвалюе кожнага работніка прадпрыемства? Безумоўна, узровень аплаты працы. Менавіта гэтая тэма і стала асноўнай у размове з калектывам Наталлі Качанавай, бо тэма адзінага інфармацыйнага дня і гучала як трыадзіная задача — «Заробак. Занятасць. Цэны».

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу прысутных на тым, што рост узроўню аплаты працы павінен залежаць ад росту прадукцыйнасці працы, інакш зарплату нельга назваць зароблена.

Дарэчы, сярэдні па краіне ўзровень заробку ў тысячу рублёў быў дасягнуты. Па выніках лістапада 2019 года гэты паказчык склаў 1113 рублёў, паведаміла прысутным Наталля Качанава. Канешне, сярэдні паказчык па краіне прадугледжвае найвышэйшы і найніжэйшы рэгіянальныя ўзроўні. Першы (па звестках за студзень—лістапад) быў зафіксаваны ў Мінску — 1505,2 рубля, другі — у Магілёўскай вобласці — крыху менш за 900 рублёў.

> У нас прынята каля трох тысяч законаў, якія працуюць эфектыўна, але жыццё не стаіць на месцы. Змяняюцца знешнія ўмовы, эканамічная сітуацыя ўнутры краіны, таму, канешне, яны патрабуюць сваёй карэкціроўкі і нейкіх навацый.

— Перад губернатарамі стаіць задача выраўноўвання заробкаў супрацоўнікаў, — звярнула ўвагу выступоўца і падкрэсліла, што адна з галоўных задач кіраўніцтва любога ўзроўню — забяспечыць рост прадукцыйнасці працы і, адпаведна, заробкаў.

Што датычыцца занятасці, то старшыня Савета Рэспублікі нагадала, што сёння занятымі ў эканоміцы краіны з'яўляюцца 4,330 мільёна чалавек. Ёсць рэгіёны, дзе фіксуецца напружанае становішча на рынку працы, а ёсць — дзе, наадварот, адчуваецца недахоп рабочых рук. Напрыклад, ёсць дэфіцыт работнікаў на Аршанскім ільнокамбінаце з заробкам 1600 рублёў. Дарэчы, нароўні з кухарамі, швачкамі і будаўнікамі ў краіне адчуваецца недахоп спецыялістаў IT-профілю і лекараў (асабліва апошніх — у сталіцы і Гомельскім рэгіёне).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

> Сустрэчы вышэйшых службовых асоб, кіраўнікоў мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў і арганізацый у працоўных калектывах праводзяцца на рэгулярнай аснове. Гэтая форма работы будзе набіраць абароты, таму што мае вялікае значэнне: калі людзі лепш інфармаваныя, у іх менш узнікае пытанняў.

Між іншым афіцыйная статыстыка сцвярджае: на 10 тысяч беспрацоўных прыпадае больш за 90 тысяч вакансій на рынку працы.

На думку Наталлі Качанавай, найбольш уразлівай катэгорыяй з пункту гледжання незанятасці ў эканоміцы з'яўляецца моладзь, таму неабходна браць на асаблівы кантроль яе працаўладкаванне.

Характарызуючы ўзровень цэн, спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу на іх адрозненне ў розных рэгіёнах краіны. Асабліва гэта датычыцца сферы паслуг: у сталіцы цэны вышэйшыя, чым на перыферыі. Але ж, згодна са статыстыкай, і даходы жыхароў сталіцы большыя, чым у тых, хто жыве за межамі кальцавой аўтамагістралі...

Наогул пытанне цэнаўтварэння і канкурэнтаздольнасці — адно з істотных. Гэта датычыцца і кандытарскай фабрыкі «Слодыч», ад павелічэння лінейкі прадукцыі якой залежыць яе прывабнасць для пакупнікоў, а таксама павелічэнне экспартнага патэнцыялу.

— Уся справа ў нас саміх: калі мы на сваіх месцах будзем добрасумленна выконваць ускладзеныя на нас абавязкі — ніякіх праблем не будзе ўзнікаць, — звярнула ўвагу Наталля Качанава.

Жыллёвае пытанне — адно з галоўных

Безумоўна, усё залежыць ад кадраў, і з гэтым нельга не пагадзіцца. Але нароўні з такім фактарам, як узровень аплаты працы, ёсць і іншыя, якія ўплываюць на замацаванне на рабочых месцах спецыялістаў. Адзін з іх быў агучаны ў якасці пытання, якое было зададзена падчас сустрэчы. Работніца з ліку маладых спецыялістаў пацікавілася магчымасцю будаўніцтва жылля ад прадпрыемства, бо менавіта тут таксама вядзецца ўлік тых, хто мае патрэбу ва ўласных «метрах».

Як растлумачыў **дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Кандытарская фабрыка «Слодыч» Аляксандр НЯЧАЙ,** на балансе прадпрыемства няма ні ўласнага інтэрната, ні арэнднага жылля. Між тым у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў зараз знаходзяцца 38 работнікаў. Атрымаць жыллё камерцыйнага выкарыстання праз адміністрацыю Партызанскага раёна Мінска таксама дастаткова складана. Яе **кіраўнік Валерый ВАРАНІЦКІ** агучыў звесткі за мінулы год: летась было выдзелена 37 кватэр камерцыйнага выкарыстання на раён, а чаргавікоў у Партызанскім раёне налічваецца каля 7 тысяч чалавек.

На думку Наталлі Качанавай, за арэндным жыллём будучыня, таму трэба канкрэтна падысці да вырашэння жыллёвай праблемы работнікаў сталічных прадпрыемстваў, напрыклад, праз будаўніцтва дома не аднаму, а некалькім суб'ектам гаспадарання — своеасаблівай талакой. Тым больш што такі вопыт у краіне ўжо існуе.

— Як гэта зрабіць, мы абмяркуем з кіраўніцтвам горада больш дэталёва і паведамім вам, — запэўніла Наталля Качанава.

Важная інфармацыя для парламентарыяў

Падобныя сустрэчы падчас адзіных інфармацыйных дзён даюць свой плён, упэўнена спікер верхняй палаты парламента:

— Сустрэчы вышэйшых службовых асоб, кіраўнікоў мясцовых органаў улады, прадпрыемстваў і арганізацый у працоўных калектывах праводзяцца на рэгулярнай аснове. Гэтая форма работы будзе набіраць абароты, таму што мае вялікае значэнне: калі людзі лепш інфармаваныя, у іх менш узнікае пытанняў, — падкрэсліла яна ў размове з журналістамі. — Заўсёды цікава паслухаць, чым жывуць работнікі канкрэтнага калектыву.

Яна звярнула ўвагу на значнасць тых праблем, якія хвалююць работнікаў канкрэтнага прадпрыемства. Як правіла, гучаць пытанні, якія датычацца жылля, сістэмы адукацыі і аховы здароўя, бо гэта тыя сферы, якія закранаюць інтарэсы кожнага чалавека ў краіне.

Наталля Качанава адзначыла, што сустрэча з прадстаўнікамі працоўнага калектыву, знаёмства з дзейнасцю прадпрыемства, яго вытворчымі паказчыкамі, спосабамі вырашэння сацыяльных пытанняў, умовамі працы і заробкамі людзей і наогул маральна-псіхалагічным кліматам у калектыве — гэта выдатная форма зносін з людзьмі, якая будзе выкарыстоўвацца надалей.

Спікер верхняй палаты парламента лічыць, што такія сустрэчы даюць магчымасць ацаніць, наколькі эфектыўна працуюць прадпрыемства і яго кіраўнік.

— Я мяркую, што гэта апраўданая форма работы з людзьмі і яна абсалютна дакладна дае свае вынікі, — упэўнена яна.

Між іншым журналісты пацікавіліся, якім чынам такія зносіны ўплываюць на заканадаўчую дзейнасць.

— А як без таго? Прэзідэнт дакладна сказаў: законы павінны быць ад зямлі. А для гэтага ты павінен мець зносіны з людзьмі, ведаць, што адбываецца. Калі на прыёмах па асабістых пытаннях ці сустрэчах з людзьмі бачыш: гэтую норму, магчыма, трэба адкарэкціраваць, тут паглядзець, як суаднесці з існуючым законам, а можа, дзесьці ўжо трэба прымаць і новы. Але там, дзе гэта неабходна. У нас прынята каля трох тысяч законаў, якія працуюць эфектыўна, але жыццё не стаіць на месцы. Змяняюцца знешнія ўмовы, эканамічная сітуацыя ўнутры краіны, таму, канешне, яны патрабуюць сваёй карэкціроўкі і нейкіх навацый, але гэта павінна быць суаднесена з тым, што адбываецца ў жыцці, на нашых прадпрыемствах, у нашай краіне. І гэта абсалютна правільна, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ПАТРЭБНАЯ ДАПАМОГА

13 студзеня шэраг членаў прэзідыума Савета Рэспублікі на чале з яго старшынёй Наталляй КАЧАНАВАЙ наведалі Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ў Бараўлянах.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сенатары разам з маленькімі пацыентамі гэтай медыцынскай установы, іх бацькамі з задавальненнем паглядзелі «Зімовую казку» — навагодняе прадстаўленне артыстаў Беларускага драматычнага маладзёжнага тэатра, якое стварыла святочны настрой прысутным напярэдадні святкавання Новага года па старым стылі. Госці не толькі павіншавалі маленькіх пацыентаў, наведалі палаты з хворымі, але і падарылі Цэнтру карысныя для лячэння тэхнічныя сродкі. У адказ сенатары атрымалі падарункі, зробленыя рукамі дзяцей.

У праграме візіту сенатараў была і другая не менш важная частка, якая датычылася пацыентаў і дактароў. За круглым сталом адбылося прадметнае абмеркаванне пытання аб стварэнні апякунскага савета пры Цэнтры. Разам са спікерам верхняй палаты парламента ў размове з медыкамі ўдзельнічалі **міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Сёння вынікі дзейнасці медыкаў Цэнтра супастаўныя з дасягненнямі вядучых роднасных замежных цэнтраў. Ужо 23 гады ў Бараўлянах аказваюць спецыялізаваную дыягнастычную і лячэбную дапамогу дзецям з анкалагічнымі гематалагічнымі захворваннямі і першаснымі (прыроджанымі) імунадэфіцытамі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Выконваюцца складаныя аперацыі, у аддзяленні трансплантацыі касцявога мозгу праводзіцца трансплантацыя ствалавых клетак.

На базе Цэнтра функцыянуе банк ствалавых клетак. Попыт на яго паслугі ў грамадзян Беларусі стабільна высокі. Летась тут адкрылася лабараторыя генетычных біятэхналогій, што дае магчымасць выйсці не толькі на новы ўзровень дыягностыкі, але таксама індывідуалізаваць лячэнне, зрабіць яго больш эфектыўным. Няўхільна расце экспарт медыцынскіх паслуг. Сярод замежных пацыентаў Цэнтра прадстаўнікі Расійскай Федэрацыі, Азербайджана, Таджыкістана, Казахстана, Украіны, Малдовы, Узбекістана, Ірана, Сірыі, Кітая.

І тым не менш у Цэнтра ёсць значныя рэзервы для актывізацыі барацьбы з анкалагічнымі захворваннямі. Як павысіць выкарыстанне патэнцыялу гэтай установы, дапамагчы яе медыкам выйсці на новы ўзровень работы, вялі гутарку за круглым сталом. Адзін са шляхоў агучылі сенатары: стварыць апякунскі савет пры Цэнтры.

> “Кваліфікаваная медыцынская дапамога павінна быць даступная кожнаму дзіцяці ў нашай краіне, у тым ліку з глыбінкі.

Як адзначыла Наталля Качанава, Савет Рэспублікі прапануе супрацоўніцтва, каб аказаць дапамогу, па меры магчымасцяў далучыцца да вырашэння актуальных пытанняў. На яе думку, кваліфікаваная медыцынская дапамога павінна быць даступная кожнаму дзіцяці ў нашай краіне, у тым ліку з глыбінкі.

Наталля Качанава запэўніла, што сенатарскі корпус гатовы падставіць плячо і дапамагчы ў канкрэтных сітуацыях. А, магчыма, нейкія пытанні давядзецца вырашаць на заканадаўчым узроўні, падкрэсліла старшыня Савета Рэспублікі.

Міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік адзначыў у размове з журналістамі, што ініцыятыва Савета Рэспублікі заслугоўвае ўвагі і падзякі. Гэта дапаможа наладзіць разуменне паміж грамадствам і медыцынай, будзе спрыяць развіццю шырокага дыялогу паміж імі. Па яго словах, умацаванне здароўя насельніцтва — гэта задача не толькі медыцынскай службы, неабходна яшчэ і скаардынаваная работа грамадства, бізнесу, сістэмы аховы здароўя.

Што плануецца зрабіць на найбліжэйшую перспектыву, пра што канкрэтна ішла гаворка за круглым сталом? Пераважна пра далейшае развіццё Цэнтра, у тым ліку і пра будаўніцтва жылля для медыкаў, умовы працы для маладых спецыялістаў і іншае.

Леанід ТУГАРЫН.

Працаваць з людзьмі і для людзей

Да такога падыходу заклікала на сустрэчы членаў Савета Рэспублікі ад Мінскай вобласці старшыня верхняй палаты парламента Наталля Качанава. Нарады з сенатарамі ад канкрэтнага рэгіёна — новая форма работы. Спікер ужо сустрэлася з прадстаўнікамі дэпутацкага корпуса ад Віцебшчыны, Гомельшчыны, Мінска, а 16 студзеня — са старшынямі раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў Віцебскай вобласці. У сераду Наталля Качанава абмеркавала праблемы прысталічча. Яна пакрэсліла, што Мінская вобласць — няпросты рэгіён. Праблем хапае па зямельных пытаннях, будаўніцтве жылля, добраўпарадкаванні тэрыторый, развіцці гарадоў-спадарожнікаў. Імкнуцца да вырашэння гэтых пытанняў па запыце кожнага жыхара рэгіёна і павінны члены Савета Рэспублікі новага склікання.

Знайсці падыход да кожнага

Работа з людзьмі — тэма, якая стала лейтматывам усіх сустрэч з сенатарамі. «Калі ёсць пытанне, якое неабходна вырашаць аператыўна, а ў вас не атрымліваецца, — калі ласка, тэлефануйце, — адзначыла старшыня Савета Рэспублікі. — Дзе трэба, хутка, аператыўна, усе разам падключымся. Любыя пытанні, якія датычацца любой праблемы. Гэта вельмі важна — нам трэба імгненна рэагаваць на тое, што кажуць людзі». Асабліва такі падыход актуальны для пытанняў невялікіх заробкаў і іх нясвоечасовай выплаты.

Кожны член Савета Рэспублікі павінен імкнуцца вырашыць праблему на сваім узроўні, а калі не атрымліваецца, неабходна звяртацца да калег. Людзі павінны бачыць работу і ведаць сваіх прадстаўнікоў у верхняй палаце парламента.

Савет Рэспублікі ўвядзе ў практыку перад пасяджэннем сесій даваць слова пэўнаму сектару, які раскажа пра дзейнасць на месцы. Таксама прадстаўнікі парламента будуць паведамляць аб рабоце са зваротамі грамадзян — колькі людзей прынялі, пытанняў разгледзелі і дапамаглі вырашыць.

Акрамя гэтага, спікер Савета Рэспублікі прапануе засяродзіць увагу на вылучэнні ў кожным доме старшынь дамавых камітэтаў ці саветаў. Такія прадстаўнікі мясцовага самакіравання стануць своеасаблівым звяном паміж уладамі і жыхарамі. «Я ўсім кажу заўсёды — трэба знайсці падыход да людзей. Начальнікі твае, якія побач з табой, яны выстраяцца пад цябе. Людзей нельга падманваць. Сказаў — зрабіў. Не можаш — скажы, што не можаш сёння, няма магчымасці», — падкрэсліла старшыня верхняй палаты парламента.

Па яе словах, старшыня райвыканкама, побач з якім сенатар і дэпутат Палаты прадстаўнікоў, — гэта сапраўдная сіла. Член Савета Рэспублікі — гэта і ўнікальная магчымасць для мясцовай улады данесці інфармацыю і праблемы рэгіёна да органаў кіравання самага высокага ўзроўню.

> “Пастаўлена задача для сенатараў — рыхтавацца да чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сфарміраваны арганізацыйны камітэт на чале з намеснікам старшыні Савета Рэспублікі Анатолем Ісачанкам.

Заканатворчасць для жыцця

На гэтым тыдні адбылася сустрэча старшынь пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі, дзе былі вызначаны кірункі сумеснай работы. Наталля Качанава ўпэўнена: сенатары павінны падключацца да работы над законамі на пачатковым этапе, каб не ўносіць карэктывы пастфактум. «Так было і ў мінулым скліканні. Нашы калегі гаварылі пра тое, што яны так працавалі. Так правільна, таму што сёння мы дакладна разумеем: усе законы, якія распрацоўваюцца, прымаюцца ў нашай краіне, павінны ісці ад жыцця. Прэзідэнт гэта дакладна сказаў», — паведаміла спікер.

Абгрунтаваныя, актуальныя пытанні і праблемы грамадзян павінны знаходзіць увасабленне ў законапраектах. Як адзначыла Наталля Качанава, у Савет Рэспублікі прыходзяць вельмі цікавыя і плённыя звароты. З гэтай прычыны неабходна крыху перагледзець структуру верхняй палаты, каб імі займалася большая колькасць спецыялістаў. Уключаны сенатары і ў дзейнасць па ўдасканаленні Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, якая цяпер актыўна ідзе ў органах улады.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Пачуць запыты на змены ў заканадаўстве магчыма, толькі сустракаючыся з людзьмі. Так, на ўласным вопыце Наталля Качанава адзначыла неабходнасць унесці карэктывы ў Дэкрэт № 18. Падставу дае гісторыя з жыцця: разведзеная пара не можа раз'ехацца з адной кватэры, а абвастрае канфлікт маці, пазбаўленая бацькоўскіх правоў.

Работа, дастойныя заробкі і даступныя цэны — тыя складнікі годнага жыцця грамадства, над якімі павінны працаваць у тым ліку і сенатары. Галоўнае ў іх дзейнасці — гэта людзі і сумленныя адносіны да іх. «Сумленнасць павінна быць ва ўсім. Калі чалавек бачыць несумленнасць у ахове здароўя, адукацыі, культуры, эканоміцы, на прадпрыемстве, не трэба праходзіць міма яго звароту», — заўважыла Наталля Качанава.

Парадак работы на будучыню

Спікер Савета Рэспублікі заклікала калег да актыўнага супрацоўніцтва са сродкамі масавай інфармацыі. На экранах тэлевізараў, у матэрыялах прэсы павінна з'яўляцца не толькі кіраўніцтва палат парламента.

Члены Савета Рэспублікі ў найбліжэйшы час вырашаць, хто будзе працаваць у міжпарламенцкіх супольнасцях (сумесных органах Саюзнай Дзяржавы, групах дружбы і іншых).

Пастаўлена задача для сенатараў — рыхтавацца да чарговага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сфарміраваны аргкамітэт на чале з намеснікам старшыні Савета Рэспублікі Анатолем Ісачанкам. Плануецца, што сёлета мерапрыемства прыме Мінск і вобласць. Па тэматыцы форум зробіць акцэнт на святкаванні 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

«Ужо зараз трэба актыўна займацца гэтым, таму што пытанняў будзе шмат. Год будзе насычаны ўсімі падзеямі. І палітычна вельмі важны год, і ў сацыяльным плане важны год. Таму нам цяпер трэба дакладна выбудоўваць гэтую работу», — заўважыла Наталля Качанава.

У найбліжэйшы час пачне працаваць даўно анансаваны маладзёжны парламент, якія сфарміруецца пад патранатам Савета Рэспублікі.

Марыя ДАДАЛКА.

КАНСТРУКТЫЎНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

НЕ ПОБАЧ, А РАЗАМ

Старшыня Мінаблвыканкама сустрэўся з парламентарыямі

Надзённыя праблемы Міншчыны ў цэлым і канкрэтных рэгіёнаў паасобку, а таксама пытанні ўзаемадзеяння парламентарыяў і выканаўчай улады былі абмеркаваны падчас сустрэчы старшыні Мінаблвыканкама Аляксандра ТУРЧЫНА з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання ад Мінскай вобласці.

— Вы сустракаецеся са сваімі выбаршчыкамі, жыхарамі вобласці.Таму хачу папрасіць, каб вы даносілі тыя праблемы, з якімі сутыкаюцца людзі. Мне цікава, чым жывуць вашы рэгіёны. Бясспрэчна, у нас ёсць інфармацыя райвыканкамаў. Разам з тым дайсці да кожнага не хапае часу. Мінская вобласць развіваецца нераўнамерна, ёсць рэгіёны, якія адстаюць. Таму вашы дапамога і падтрымка нам вельмі патрэбныя. Хочацца, каб і наша думка была ўлічана пры рэалізацыі тых нарматыўна-прававых актаў, якімі, упэўнены, вы будзеце шчыльна займацца падчас сваёй прафесійнай дзейнасці. Раёны часта сутыкаюцца з пытаннямі, якія ім не пад сілу. Яны патрабуюць вырашэння на заканадаўчым узроўні, — адзначыў Аляксандр Турчын.

Вядома, на месцах людзі хочуць жыць у камфорце, не горш, чым у горадзе: мець усё пад рукой, побач з домам — і бальніцу, і дзіцячыя садкі, і басейн. Зразумела, грошай на ўсё не хапае. Таму, на думку губернатара, неабходна вызначыць прыярытэты і пазбаўляцца ад тых праблем, якія выклікаюць клопаты або справядлівыя нараканні людзей. І, вядома, у гэтыя працэсы неабходна ўцягваць саміх жыхароў, для таго каб яны адчувалі свой уплыў на прыняцце таго ці іншага рашэння.

— Задач шмат, — канстатаваў Аляксандр Турчын. — Але наша агульная задача — дабрабыт краіны, людзей. І тут не павінна быць рознагалосся. Мы ўсе — адна каманда. Я заўсёды гатовы сустрэцца з вамі, выслухаць канструктыўныя прапановы. На працягу наступнай пяцігодкі нам неабходна ўдвая павялічыць даходы грамадзян. Эканоміка павінна працаваць на агульны вынік. Для нас гэта важная, напружаная і карпатлівая работа.

Старшыня Мінаблвыканкама звярнуў увагу парламентарыяў на тое, каб яны бралі ўдзел у пасяджэннях райвыканкамаў, прычым не проста прысутнічалі, а праяўлялі актыўнасць у абмеркаванні праблем, даносілі іх да ўлады.

Аляксандр Турчын выслухаў таксама прапановы дэпутатаў па розных аспектах развіцця Міншчыны.

— Сённяшняя сустрэча важная не толькі з пункту гледжання глыбіні праблем кожнага рэгіёна, але і з пазіцый выпрацоўкі сістэмных рашэнняў, узаемаадносін парламентарыяў і Мінаблвыканкама. У нас адна мэта, якую мы рэалізуем кожны на сваім полі, — адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла НІЖЭВІЧ.**

Парламентарый лічыць, што варта звяртаць больш увагі на развіццё сферы паслуг, у тым ліку і турыстычных. Акруга, якую яна прадстаўляе, багатая на помнікі гісторыі, архітэктуры, вядомых пісьменнікаў, творчых людзей. Але далёка не ўсе пра гэта ведаюць. Яна таксама выказала пажаданне, каб Мінаблвыканкам інфармаваў дэпутатаў аб планах на найбліжэйшы год, з тым каб яны маглі данесці іх да жыхароў, сваіх выбаршчыкаў.

Дэпутат ад Барысаўскай сельскай акругі № 63, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Лілія АНАНІЧ упэўнена, што дэпутаты ўважліва ставяцца да кожнага звароту, з якім заяўнік прыходзіць на прыём. Пры гэтым варта імкнуцца падкрэсліць, што пытанне вырашаецца ў межах заканадаўства і магчымасцяў. Часам не адразу, але чалавеку неабходна растлумачыць, з якой прычыны так адбываецца, а таксама — калі яно можа быць вырашана.

— Наша задача — ісці да людзей, інфармаваць пра тое, як сёння жыве краіна, якія прыярытэтныя кірункі, і падштурхоўваць грамадзян да таго, каб больш звярталі ўвагі на рэчы, якія яны могуць зрабіць самі, — па добраўпарадкаванні тэрыторыі або іншых пытаннях, якія залежаць у тым ліку і ад іх саміх, — сказала яна.

Напрыканцы Аляксандр Турчын папрасіў дэпутатаў уважліва адсочваць і вывучаць праблемы сваіх акруг. Раённыя цэнтры павінны быць камфортныя для пражывання. Толькі ў гэтым выпадку людзі будуць імкнуцца жыць на сваёй малой радзіме, нават калі працуюць у іншай мясцовасці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

На асабісты прыём грамадзян да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргея СІЎЦА запісаліся 14 чалавек з разлікам на станоўчае вырашэнне самых розных пытанняў.

Эфектыўны спосаб даведацца аб праблемах у рэгіёнах

Усе наведвальнікі былі пачуты, іх заявы былі прыняты для дадатковага вывучэння.

Напрыклад, жыхарка з Ракава якая заблыталася з працэдурай выкупу дома. Ён некалі быў выдзелены ёй для пражывання як работніцы завода ацяпляльнага абсталявання. Аднак пакуль доўга і марудна рухалася працэдура афармлення дакументаў, прадпрыемства абанкруцілася. У завода з'явіўся антыкрызісны кіраўнік, які змяніў умовы выкупу жылля і запатрабаваў згодна з новай ацэнкай кошту дома адначасова выплаціць усю яго суму (28 тысяч рублёў). У іншым выпадку дом выставяць на аўкцыён. Такіх грошай жанчына не мае, іншага жылля ў яе няма. Што рабіць? Вось і просіць Савет Рэспублікі дапамагчы.

Жыллёвае пытанне таксама прывяло ў Савет Рэспублікі 82-гадовую мінчанку. Яна не згодная з тым, як была праведзена прыватызацыя яе ведамаснай кватэры з аплатай у растэрміноўку на 40 гадоў.

А ў двух жыхароў Гродзенскай вобласці ўзніклі сур'ёзныя рознагалоссі з судова-прававой сістэмай. Незадаволеныя рашэннем суда першай інстанцыі, яны звярталіся і ў Вярхоўны суд, і ў Генеральную пракуратуру, але атрымалі адмоўныя адказы. Таму і запісаліся на прыём да старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. Сяргей Сівец быў вымушаны правесці кароткі прававы лікбез аб межах кампетэнцыі Савета Рэспублікі, яго магчымасцях і паўнамоцтвах.

Ён нагадаў, што па сваім статусе Савет Рэспублікі з'яўляецца палатай тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. У сувязі з гэтым арганізацыя асабістых прыёмаў грамадзян сенатарамі, на яго погляд, адзін з самых эфектыўных і дзейсных спосабаў даведацца непасрэдна ад саміх людзей аб праблемах у рэгіёнах.

Што датычыцца сённяшняга прыёму, то пераважалі звароты прыватна-прававога характару, звязаныя з рэалізацыяй суб'ектыўных правоў грамадзян, паведаміў потым журналістам Сяргей Сівец. Але ён прыгадаў і звароты публічна-прававога характару. Напрыклад, людзі прапануюць захады па ўдасканаленні дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання, уносяць канкрэтныя прапановы па карэкціроўцы заканадаўства. Такія звароты сведчаць пра актыўную жыццёвую пазіцыю нашых суграмадзян, іх неабыякавасць, шчырае жаданне быць карыснымі радзіме, адзначыў сенатар.

Як запэўніў Сяргей Сівец, усе звароты наведвальнікаў у Савет Рэспублікі стануць аб'ектам пільнай і сістэмнай увагі, па кожным будзе дадзены кваліфікаваны адказ. Таксама дэталёва прааналізуюць праблемы, з якімі людзі прыйшлі на прыём.

Леанід ТУГАРЫН.

ШТО РАБІЦЬ З НЯДОБРАСУМЛЕННАЙ КАНКУРЭНЦЫЯЙ?

Сенатар Таццяна РУНЕЦ правяла ў Мінску свой першы асабісты прыём грамадзян у якасці старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах.

І першы ж наведвальнік з Магілёва агучыў пытанне, якое нават пры дэтальным разглядзе ў час прыёму акрэсліла дастаткова злабадзённую праблему.

Сутнасць звароту ў наступным. Прыватнае прадпрыемства магіляўчаніна з'яўляецца афіцыйным перавозчыкам па маршруце Магілёў—Гомель. Для гэтага задзейнічаны сем мікрааўтобусаў умяшчальнасцю ад 16 да 21 чалавека (чатыры аўтобусы 2018 года выпуску). Транспартнае прадпрыемства спраўна плаціць з прыбытку ўсе неабходныя зборы і падаткі.

І ўсё было б нічога, пакуль не з'явіліся, мякка кажучы, нядобрасумленныя канкурэнты. Яны нахабным чынам крадуць кліентаў і, канешне, не плацяць нічога ў бюджэт. Паводле слоў заяўніка, робіцца ўсё надзвычай адкрыта. Нелегальныя перавозчыкі за 7—10 хвілін да адпраўлення мікрааўтобуса законапаслухмяных канкурэнтаў падганяюць сваю маршрутку з добра бачным надпісам «Магілёў—Гомель» на прыпынак грамадскага транспарту побач з вакзалам, забіраюць пасажыраў і наперад. У выніку афіцыйны перавозчык апынуўся на мяжы банкруцтва. Бо нават калі ў яго мікрааўтобус набудуць білет два чалавекі, трэба выязджаць у рэйс. А гэта немалыя страты.

Так, былі звароты ў інстанцыі горада і вобласці, у пракуратуру, Камітэт дзяржкантролю, падатковую інспекцыю, ДАІ, Транспартную інспекцыю з просьбай не даць несумленным канкурэнтам зруйнаваць прадпрыемства. Аднак сам факт запісу прадпрымальніка на прыём да старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах сведчыць пра тое, што пытанне засталося нявырашанае. Ён не верыць у тое, што на мясцовым узроўні яго можна зварухнуць з месца. Таццяна Рунец пастаралася ўнікнуць у розныя аспекты праблемы, задала шмат дакладных пытанняў па тэме. Прызналася, што падобная праблема існуе і ў Мінску, дзе таксама вырашаецца цяжка і марудна. Але пытанне цікавае, і яна бярэ яго пад кантроль.

Тут трэба мець на ўвазе, што сёння ўсе прыватныя структуры ў той ці іншай ступені існуюць ва ўмовах канкурэнцыі. У прынцыпе гэта нармальная, правільная і станоўчая з'ява. Менавіта канкурэнцыя спрыяе развіццю эканомікі, асабліва сферы паслуг, у цэлым зніжэнню цэн. Адсутнасць канкурэнцыі вядзе да застою. А куды ж вядзе нядобрасумленная канкурэнцыя? У ценявую эканоміку і як мінімум ва ўхіленне ад падаткаў.

Таццяна Рунец паабяцала грунтоўна разам са спецыялістамі разабрацца як у магілёўскай, так і ў іншых праблемах, з якімі ў той дзень да яе звярнуліся людзі. Іх пытанні датычыліся зямельных спрэчак з мясцовай уладай, паслуг ЖКГ, рамонту сацыяльнага жылля. Старшыня Пастаяннай камісіі запэўніла, што звароты грамадзян не застануцца па-за ўвагай і мясцовых органаў улады, куды спярша звярнуліся людзі і дзе іх не пачулі. Сенатар адзначыла, што прыёмы грамадзян дазваляюць з першых вуснаў даведацца пра тыя праблемы, з якімі сутыкаюцца людзі. У гэтым вялікая каштоўнасць такой формы работы.

Леанід ТУГАРЫН.

Тэлесеткі

УСКОЧЫЦЬ У АПОШНІ ВАГОН

Сёння апошні дзень прыёму заявак на нацыянальны адбор міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2020».

Нагадаем, ён праходзіць у тры этапы: разгляд дасланых заявак і жывое праслухоўванне ўдзельнікаў (вынікі яго будуць абвешчаны 27 студзеня), фінал адборачнага тура ў фармаце гала-канцэрта і выбар пераможцы гледачамі і журы (да 6 сакавіка) і ўласна падрыхтоўка афіцыйнага прадстаўніка Беларусі да выступлення ў Ратэрдаме.

Па-ранейшаму ўзяць удзел у беларускім адборы могуць не толькі нашы суайчыннікі, але і замежнікі і асобы без грамадзянства, якія жывуць у нашай краіне, пры ўмове, што выканаўцам споўнілася як мінімум 16 гадоў, а конкурсная песня не гучала і не была камерцыйна рэалізаваная да 1 верасня мінулага года. Заяўкі дасылаюцца праз афіцыйны сайт Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by. Як расказалі «Звяздзе» ў медыяхолдынгу, сярод прэтэндэнтаў ёсць і навічкі, і вядомыя артысты, а таксама выканаўцы і калектывы, якія штурмуюць нацыянальны адбор ужо не першы раз.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«ПЕСНЯ ГОДА — 2019» ХУТКА НА ЎСІХ ЭКРАНАХ

Грандыёзнае музычнае шоу «Песня года Беларусі — 2019» ужо ў гэтую суботу збярэ папулярных артыстаў і іх прыхільнікаў у Палацы спорту. А тэлеверсію музычнай прэміі ў дзвюх частках мы зможам убачыць на тэлеканале АНТ 25 студзеня.

Удзел у вялікім канцэрце возьмуць больш за тры дзясяткі беларускіх артыстаў, сярод якіх Uzari, Іскуі Абалян, Ганна Шаркунова, Аляксандр Саладуха, Анатоль Ярмоленка, Анжаліка Пушнова, Саша Нэма, гурты NaviBand, Las Vegas, AURA і многія іншыя. А хэдлайнерам шоу стане Ціма Беларускіх.

Нагадаем, спіс удзельнікаў гала-канцэрта быў сфарміраваны тэлеканалам АНТ з улікам галасавання інтэрнэт-карыстальнікаў, афіцыйных звестак радыёстанцый па ратацыі песень, а таксама ўнёску саміх аўтараў і выканаўцаў у развіццё беларускай нацыянальнай музычнай культуры.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 105

Падведзены вынікі 20-га чэмпіянату Рэспублікі Беларусь па шашачнай кампазіцыі (шашкі-64), які праводзіўся ў пяці раздзелах. Тройкі прызёраў па раздзелах выглядаюць наступным чынам: Пётр Шклудаў (Наваполацк), Віктар Шульга, Леанід Рыбакоў (абодва Мінск) — раздзел «Эцюды». П. Шклудаў, Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў), Аляксандр Перавознікаў (Рагачоў) — мініяцюры. У раздзеле «Праблемы» перамог Мікалай Ляшкевіч (Мінск), на другім месцы П. Шклудаў, на трэцім Д. Камчыцкі. У дамачных праблемах першынстваваў М. Ляшкевіч, другі А. Перавознікаў, трэці П. Шклудаў. У раздзеле «Бразільская версія» залаты медаль у Дзмітрыя Камчыцкага, «серабро» ў Віталя Варушылы (Мінск). «Бронза» ў М. Ляшкевіча.

Прапануем нашым чытачам пазнаёміцца з кампазіцыямі пераможцаў.

№ 7



№ 7 В. Варушыла

Кампазіцыя складзена ў бразільскіх шашках.

Белыя простыя шашкі: c1, e1, b2, f2, d4, c5, a7 (7).

Чорныя простыя шашкі: a3, c3, g5, d6, c7, e7, b8 (7).

№ 8 Л. Рыбакоў

Белыя простыя шашкі: e7, белыя дамкі: e3, b6 (3).

Чорныя простыя шашкі: g7, b8, чорныя дамкі: e1 (3).

№ 9 М. Ляшкевіч

Белыя простыя шашкі: e1, d2, f2, e3, g5, b6, d6, c7, e7 (9).

Чорныя простыя шашкі: b2, h2, c3, b4, f4, e5, h6, a7, g7 (9).

№ 10 А. Перавознікаў

Белыя простыя шашкі: b2, h4, b6, c7, e7 (5).

Чорныя простыя шашкі: a3, e3, b4, f4, a5 (5).

№ 11 П. Шклудаў

Белыя простыя шашкі: b2, d2, белыя дамкі: b8, e1, g1, (5).

Чорныя простыя шашкі: h2, b4, f4, b6, f6, g7, чорныя дамкі: c5, e5 (8).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Анонс: з 24 студзеня да 2 лютага ў РЦАП па шахматах і шашках (Мінск, вуліца К. Маркса, 10) адбудуцца чэмпіянаты Беларусі па шашках-64 сярод мужчын і жанчын. Чакаецца ўдзел пяці міжнародных гросмайстраў у мужчын і трох у жанчын. 25 студзеня ўпершыню пройдзе чэмпіянат Беларусі па шашках-64 па маланкавай гульні.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 104 ад 03.01.20.

№ 1 1. 43-39? 24-29 2. 33:24 23-29 3. 24:33 26-31 4. 37:26 19-23 5. 28:08 17:48 6. 26:17 03:25]+

№ 3 1. f4-e5 d4xh4 2. a7-b8 f2xd4 3. b8-d6 c5xe7 4. h2-g3 h4xf2 5. g1xc1+

№ 4 1. c5-b6 a5xc7 2. d2-e3 f4xb4 3. c1-b2 a3xc1 4. g3-f4 e5xg3 5. h2xf4 c1xg5 6. h4xh8+

№ 5 1. h4-g5 f6xf2 2. d4xh8 f2xd4 3. c3xc7 a1xg7 4. h8xd8 b8xe5 5. d8-c7 e5xb8 6. g1-h2+

№ 6 1. f2-e3 f4xd2 2. g1-f2 c5xg1 3. b2-c3 d2xb4 4. a3xe7 f8xd6 5. h6xa7 g1-f2 6. a7xg1+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

Пачынаем раніцу па-новаму

Днямі тэлеканал АНТ запусціў новы сезон праграмы «Наша раніца». Акрамя змянення графічнай упакоўкі з'явіліся таксама новыя рубрыкі і свежы кантэнт для аўдыторыі: «Сняданак халасцяка», гімнастыка для тых, каму за 60, і новы вядучы з народу!

Так, да кампаніі асноўнага складу ранішніх вядучых далучыўся Дзмітрый Церахаў. Ён з'яўляецца на экране ў пары з Таццянай Рудакоўскай, а Аляксандр Сярэбранікаў цяпер жадае гледачам добрай раніцы ў пары з Верай Паляковай. Варта адзначыць, што Дзмітрый трапіў у каманду АНТ пасля кастынгу, які тут ладзілі летась у некалькі этапаў напрыканцы года. Змагацца за месца пад сафітамі маладому чалавеку давялося з 300 кандыдатамі. Але менавіта на яго асобе спыніла ўвагу фокус-група на фінальным этапе адбору. Абаяльны вядучы ўжо мае ў сваім арсенале вопыт гульні ў КВЗ, вядзенне ранішняй праграмы на Гродзенскім ТБ і валодае дзвюма замежнымі мовамі.

Што да новых рубрык, то тут выбірай на любы густ. Для тых, хто хоча разнастаіць сваё харчаванне, раз на тыдзень будзе выходзіць «Сняданак халасцяка» з Германам Цітовым. Хлопцам у вялікіх і малых гарадах і вёсках прапануюць рэцэпты сучасных і карысных страў, лайфхакі па куплі і прыгатаванні прадуктаў. А тая частка аўдыторыі, якая ў любым узросце клапоціцца пра сваё здароўе і любіць спорт, кожную раніцу разам з алімпійскай чэмпіёнкай Алай Цупер і тэлевядучым Сяргеем Собалем зможа атрымаць зарад бадзёрасці і пазітыву і навучыцца адчуваць сваё цела. Для іх з'явілася рубрыка «Зарадка для тых, каму за...». Калі ж вас хвалююць пытанні больш грунтоўныя — нерухомасці альбо дзейнасць прафсаюзаў, юрыдычныя тонкасці, то адказы зможаце пашукаць у новых рубрыках «Прафсаюз адказвае», «Юркансультацыя», «Нерухомасць», у якіх раз на тыдзень спецыялісты будуць даваць кампетэнтныя адказы, парады і дапамагаць вырашыць складаныя сітуацыі... У рубрыцы «Ошибок.нет» дзеці-вядучыя будуць выпраўляць акцэнталагічныя памылкі і вучыць правільна ставіць націскі (прычым слова ў правільным варыянце падаецца і па-руску, і па-беларуску). А тэлесіноптык Дзмітрый Рабаў зробіць усё, каб кожны дзень вы былі падрыхтаваны да любых перамен надвор'я і не змерзлі. З'явілася новая рубрыка і для прыхільнікаў рыбалкі. У фармаце відэаблога гледачы змогуць раз на тыдзень пабываць «На рыбалцы з Канстанцінам Сцепанцом». Карэспандэнт раскажа пра самыя цікавыя рыбалоўныя хітрасці і падзеліцца сакрэтамі, як бавіць час у адрыве ад цывілізацыі.

— Некаторыя відэа з вандровак гледачы ўбачаць першымі. Але славіць рыбу — гэта не самамэта. Тут больш ухіл на тое, што Беларусь можна ўгледзець зусім у іншых ракурсах — з вады яна выглядае інакш, а ў некаторыя месцы нічым акрамя лодкі наогул не дабярэшся, — расказвае Канстанцін.

Алена ДРАПКО.
Фота Вікторыі ЦЕЛЯШУК і з асабістага архіва вядучага.

Бліц-інтэрв'ю з Канстанцінам Сцепанцом:

1. Для вас рыбалка — гэта спорт ці адпачынак з асаблівай атмасферай? — Рыбалка з'яўляецца маім хобі, але яна больш дадатак да вандровак, у якіх я атрымліваю ўражанні ад стасункаў з прыродай.

Многае могуць зрабіць дэпутаты ў вырашэнні праблем занятасці і самазанятасці насельніцтва, у іх сілах садзейнічаць таму, каб людзі маглі самастойна зарабляць, спрыяць паляпшэнню іх жыцця не калісьці ў будучыні, а сёння.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

А ШТО Ў РЭГІЁНАХ?

«БЮДЖЭТ НАКІРАВАНЫ НА ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ТРЭБА НЕАДКЛАДНА ВЫРАШАЦЬ»

На сесіі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў зроблены акцэнт на інвестыцыях і жыллёва-камунальнай гаспадарцы

Прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця Гродзенскай вобласці сфарміраваны з удзелам экспертаў Міністэрства эканомікі і Міністэрства фінансаў Беларусі. Большая частка бюджэту датычыцца сацыяльнай сферы. Разам з тым адным з актуальных кірункаў з'яўляецца развіццё інвестыцыйнай дзейнасці.

На сесіі было адзначана, што бюджэт вобласці крыху вырас, што сведчыць пра станоўчую дынаміку развіцця рэгіёна. Выконваюцца ключавыя параметры эканомікі, якія забяспечваюць прырост. Добра спрацавалі прамысловасць, транспарт, гандаль. Пакуль недацягваюць сельская гаспадарка і будаўніцтва, але і ў гэтых сферах намецілася станоўчая тэндэнцыя.

— Бюджэт — гэта закон вобласці. Трэба сказаць, што ў рэгіёна дастаткова амбіцыйныя планы, і для гэтага ёсць падстава — рост валавога рэгіянальнага прадукту — 103 %, — адзначыў **намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Валерый МІЦКЕВІЧ.** — Сёлета дэпутаты будуць накіраваны на павелічэнне фінансавання рознага роду сацыяльных праграм, інфраструктуры, каб жыццё стала больш камфортным. У прыватнасці, у Лідзе прадугледжаны рамонт і будаўніцтва бальніцы, там ёсць такая праблема.

Расходы ў большасці будуць скіраваны менавіта на развіццё сацыяльнай сферы. Гэта і ахова здароўя, і адукацыя, сацыяльнае і пенсійнае забеспячэнне — усё тое, што робіць краіну сацыяльна арыентаванай дзяржавай. У вобласці на гэтыя мэты будзе выдаткавана 70 % бюджэту.

— Дэпутаты зацікаўлены ў тым, каб усе сродкі выкарыстоўваліся рацыянальна, максімальна эфектыўна. Каб расходная частка папаўнялася, важнае значэнне мае інвестыцыйная дзейнасць, бо інвестыцыі — гэта і заработная плата, і экспарт, і новыя прадпрыемствы, і праблема занятасці, — падкрэсліў **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК.**

Менавіта інвестыцыі павінны вызначыць далейшае развіццё рэгіёна. Сёлета вобласць плануе атрымаць вынікі ад папярэдніх праектаў і закласці аснову будучага. Таму гэты працэс пад асобым кантролем як дэпутатаў, так і выканаўчай улады. Усяго ў вобласці сфарміравана больш за 300 інвестыцыйных праектаў, але ёсць прыярытэтныя. Па словах **старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА,** асаблівая ўвага будзе ўдзяляцца чатыром асноўным праектам, якія ўваходзяць у пералік 35 найважнейшых праектаў рэспублікі. Гэта АЭС, азотны комплекс, цэментны завод і шклозавод «Нёман». Усе яны павінны выйсці на рэнтабельную работу.

— Завяршаецца буйны праект — будаўніцтва АЭС, якая ўводзіцца ў 2020 годзе, і пачнецца рэалізацыя новага значнага праекта — будаўніцтва азотнага комплексу коштам больш за мільярд долараў. Ёсць усе перадумовы, каб прыступіць да будаўніцтва сёлета і да канца пяцігодкі атрымаць вынік, — падкрэсліў Уладзімір Краўцоў.

Увогуле размеркаванне бюджэту накіравана на праблемы, якія неабходна неадкладна вырашаць. Значнае месца адводзіцца праблемам жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у першую чаргу вострым пытанням па чыстай вадзе ў сельскай мясцовасці. Гэтая работа цяпер актыўна вядзецца, летась пабудавана 45 станцый абезжалезвання, сёлета запланавана запусціць яшчэ 42 станцыі. Такім чынам за некалькі гадоў праблема чыстай вады будзе вырашана ва ўсіх аграгарадках вобласці, запэўніў кіраўнік рэгіёна.

Таксама ў сістэме ЖКГ будзе працягвацца работа па замене цепласетак, што дазволіць паменшыць страты цяпла да 10 %. Будзе заменена 125 ліфтаў, якія адпрацавалі свой тэрмін, — гэтая работа апошнім часам значна актывізавалася. Дэпутаты адзначылі, што менавіта праблема ЖКГ выклікае нямала пытанняў і скаргаў з боку жыхароў, асабліва пытанні, якія датычацца капітальных рамонтаў. Таму сёлета плануецца адрамантаваць больш квадратных метраў, чым летась. Частковае фінансаванне работ па энергазберажэнні і рамонце будзе весціся за кошт рэсурсаў міжнароднага Банка рэканструкцыі і развіцця.

Паколькі Гродна — прыгранічны рэгіён, важна, каб тут развіваліся інфраструктурныя праекты, у тым ліку, транспартныя. Адзін з іх — будаўніцтва трасы М6 — амаль завершаны. Разам з тым ёсць нямала праблем і па мясцовых дарогах, пра што сведчаць звароты жыхароў. Як адзначыў Уладзімір Краўцоў, самы аўтамабілізаваны рэгіён павінен мець добрыя дарогі. Згодна з урадавай праграмай, у вобласці адрамантавана і пабудавана 900 кіламетраў дарог. На гэтую работу закладзены значныя сродкі і сёлета.

Што датычыцца сацыяльнай сферы, куды пойдзе большасць бюджэтных сродкаў, дык тут галоўная задача — павысіць зарплату работнікаў. Мяркуецца, што яе памер будзе павялічаны на 16 %.

Прадугледжана і стварэнне цэнтраў аховы здароўя. Такія цэнтры пачнуць працаваць у чатырох гарадах — Гродне, Лідзе, Ваўкавыску і Астраўцы. Тут будуць выдаткаваны сродкі на мадэрнізацыю абсталявання, што дазволіць выконваць складаныя тэхналагічныя аперацыі. Ёсць супольная праграма з Міністэрствам аховы здароўя, у якой закладзены значныя сродкі на гэтыя мэты.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

РЭЗЕРВЫ «МЯСЦОВАЙ СКАРБОНКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Развіццё прадпрымальніцтва, самазанятасці — гэта адзін з даходных артыкулаў сельскіх Саветаў, і мы гэтым цяпер шчыльна займаемся, — кажа старшыня райсавета. — Яшчэ адзін са спосабаў папоўніць бюджэт — прыцягнуць сродкі звонку. Кожны год грошай на добраўпарадкаванне выдзяляецца ўсё менш. І мы матывуем людзей удзельнічаць у навядзенні парадку на роднай зямлі. Прычым у першую чаргу адштурхоўваемся ад інтарэсаў жыхароў пэўнай тэрыторыі. Напрыклад, узнікла неабходнасць будаўніцтва дадатковай аўтапаркоўкі (іх часта не хапае там, дзе старая забудова) або дзіцячай пляцоўкі. На такія ініцыятывы людзі ахвотна здаюць грошы, і дзяржава не застаецца ўбаку. Мы купляем абсталяванне, а тэрыторыю акультурвае насельніцтва. Тут і ініцыятыва, і скарачэнне бюджэту, і добраўпарадкаванне.

Няма работы — няма падаткаў

Вялікі рэзерв — гэта не занятыя ў эканоміцы людзі. Але як іх зацікавіць?

— Апошнія тры гады мы адкрываем па 80 рабочых месцаў у год, але вялікага попыту няма, — сведчыць Анатоль Мацюлін. — На камісіях па садзейнічанні занятасці разглядаем кожнага чалавека, які звальняецца, клапоцімся, каб ён не застаўся без даходаў. Бо пры гэтым скарачаюцца даходы ў мясцовы бюджэт: няма падатку ні ад работніка, ні ад прадпрыемства. Павінна быць адна матывацыя — працаваць. Толькі ў гэтым выпадку ў раёна будзе магчымасць мацнець і развівацца.

Для сельскіх тэрыторый тыповая сітуацыя: прадпрыемствы, якія раней паспяхова працавалі на эканоміку раёна, або абанкруціліся, або сталі філіяламі абласнога, рэспубліканскага падпарадкавання. З аднаго боку, гэта моцна падкасіла даходную частку раённых бюджэтаў. З другога — сіламі раёна наўрад ці атрымалася б зрабіць пераўзбраенне старых прадпрыемстваў і паставіць іх на новыя рэйкі. А ў тым выглядзе, у якім яны існавалі, нават размовы не можа быць пра канкурэнцыю на міжнародным рынку. Ды і варыцца ў сваім соку яны доўга таксама не змаглі б.

— Мінулы год быў цяжкі, мы не выканалі бюджэт, даводзілася яго пераглядаць, — канстатуе Анатоль Мацюлін. — Сельскагаспадарчыя арганізацыі недабралі ўраджай. Падвёў і некалі асноўны падаткаплацельшчык — завод ЖБВ, які мае патрэбу ў пераўзбраенні. Шукаем інвестара. Патрэбны прарыўны праект, каб вярнуць завод да жыцця і павысіць даходы, бо цяпер ён у стратах. Затраты на сыравіну, электраэнергію і іншыя рэчы растуць. Патрэбныя аўтаматызацыя, энергазберагальныя мерапрыемствы.

Большасць раёнаў Магілёўскай вобласці, і Чавускі не выключэнне, арыентуецца сёння на развіццё сферы паслуг. І гандаль — адна з тых крыніц, якія адчувальна папаўняюць бюджэт. На жаль, тут таксама ёсць падводныя камяні. Сёння, напэўна, не засталося ніводнага райцэнтра, дзе б не працаваў вядомы сеткавік. Спажыўцы задаволеныя, але раёны, на жаль, багацейшыя не становяцца.

— Асноўныя падаткі, за выключэннем падаходнага, гэтыя прадпрыемствы плацяць па месцы рэгістрацыі, — заўважае суразмоўца. — А наш галоўны гандлёвы партнёр і падаткаплацельшчык — райспажыўкааперацыя — сёння прыкметна падсаджваецца.

Што можа зрабіць дэпутат

Калі дэпутат — кіраўнік прадпрыемства, ён можа паўплываць на павелічэнне даходнай часткі бюджэту сваёй дзейнасцю. Наогул народныя абраннікі зацікаўлены прыйсці на «хворае» прадпрыемства, разам з людзьмі разабрацца, чаму зніжаюцца даходы ў бюджэт, паразважаць, як вырашыць гэтую праблему, бо яна цягне за сабой шэраг іншых. Цяжэй, напрыклад, становіцца ўтрымліваць сацыяльныя аб'екты на перыферыі, дзе колькасць жыхароў імкліва скарачаецца.

У Чавускім раёне сем сельсаветаў. Там таксама асноўны даход — мясцовыя падаткі. А на сяле іх яшчэ менш, чым у райцэнтры. Таму вітаецца грамадская актыўнасць.

— Сацыяльныя стандарты там забяспечваюцца, а вось на нешта большае трэба шукаць грошы, — кажа дэпутат. — Старасты, старшыя вулічных камітэтаў разам з насельніцтвам вызначаюць, што для іх важна. Напрыклад, вырашылі зрабіць зону адпачынку. Грошай няма, значыць, трэба ўласнай працай з дапамогай арганізацый ці прадпрыемстваў вырашыць пытанне. Гэта не тое самае, што зрабіць заяўку ў бюджэт і табе яе прафінансуюць. Калі людзі самі папрацуюць, яны і цаніць гэта будуць лепш.

Сёння галоўная наша роля — навучыцца чуць чалавека і заахвоціць яго працаваць з ініцыятывай. Нават згуртаваць народ трэба ўмець. Адна справа, калі чалавек ідзе на прыём з асабістым пытаннем, і іншая, калі з грамадскім. Чаму менавіта гэты чалавек, а не мы выступілі ад імя жыхароў? Яму больш даверяюць?

Спаборніцтва паміж дамамі

Лішніх грошай у бюджэце няма, але нічога не перашкаджае іх прыцягнуць звонку. Напрыклад, дэпутат Гагарынскай акругі (мікрараён ільнозавода ў Чавусах) Алена Максімовіч паўдзельнічала ў праекце «Эфектыўнае ўзаемадзеянне, сучаснае кіраванне — устойлівы вынік», які праводзіла абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, і атрымала грошы на дзіцячую пляцоўку. Але перад тым яна разам з прадстаўнікамі мясцовага самакіравання, лічы — актыўнымі гараджанамі, распрацавала план спаборніцтва паміж шматпавярховікамі, жыхары якіх вырашылі паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні! Людзі фарбавалі агароджы, уваходныя групы дамоў, рабілі кветнікі. І як прыз атрымалі дзіцячую пляцоўку. Нядаўна дэпутат выйграла 10 тысяч долараў на развіццё мікрараёна. На гэтыя грошы будуць зроблены спартыўная пляцоўка і міні-сцэна, на якой можна будзе праводзіць культурныя мерапрыемствы.

— Раней жыхары чакалі, што нехта прыйдзе і ўсё ім зробіць, а потым, натхнёныя сваёй абранніцай, сабралі тысячу рублёў і самі ўзяліся за справу — зрабілі лавачкі, упрыгожылі тэрыторыю, а мы напоўнілі яе гульнявым абсталяваннем. Гэта яркі прыклад узаемадзеяння прыватнай ініцыятывы з уладай. І далей будзем развіваць гэтую тэндэнцыю. Раней амаль у кожным мікрараёне Чавус быў завод, які будаваў жыллё для сваіх рабочых і ўсю інфраструктуру. Цяпер заводаў няма, а парадак трэба падтрымліваць. І зрабіць гэта без дапамогі насельніцтва немагчыма.

Раз у квартал праводзім суботнікі, разам з людзьмі шукаем сродкі на ўтрыманне тэрыторый. Мы вучым жыхароў, як вызначаць стратэгію развіцця, аб'ядноўвацца, прыцягваць рэсурсы. Стварылі сайт асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў, які напаўняем карыснай інфармацыяй. І сітуацыя пакрысе мяняецца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

❍ У тэму

ШТО Ў АБЛАСНОЙ «КІШЭНІ»?

Незадоўга да навагодняга свята на сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў па традыцыі ішла размова пра сродкі на наступны год

Старшыня абласнога парламента Уладзімір Цярэнцьеў падкрэсліў, што бюджэт на 2020-ы застанецца сацыяльна накіраваны — на 66,6 %. Найбольшае фінансаванне атрымаюць сферы адукацыі — 31,5 %, аховы здароўя — 24,9 %, сацыяльнай палітыкі — 5,9 %.
Між іншым усе бюджэты раёнаў і гарадоў паўночнай вобласці краіны датацыйныя, за выключэннем Віцебскага раёна. Сярэдні ўзровень датацыйнасці па вобласці складае 31,8 %, раёнаў — 42,8 %, гарадоў абласнога падпарадкавання (Віцебск, Наваполацк) — 16 %.

Уласныя даходы мясцовых бюджэтаў Віцебскай вобласці вызначаныя ў памеры 1519,5 мільёна рублёў, або з ростам 4,2 % да даходаў 2019 года.

У структуры даходаў бюджэту вобласці прагназуюцца паступленні падатковых даходаў — 1397,6 мільёна рублёў (92 % ад уласных даходаў), непадатковых — 121,9 мільёна рублёў (8 %).

Асноўную долю ў структуры даходаў мясцовых бюджэтаў Віцебскай вобласці складаюць: падаходны падатак з фізічных асоб — 551,6 мільёна рублёў, падатак на дабаўленую вартасць — 470,3 мільёна рублёў, падаткі на ўласнасць — 143,9 мільёна рублёў, падатак на прыбытак — 112,3 мільёна рублёў.

З рэспубліканскага бюджэту перадаюцца бязвыплатныя паступленні — 928,2 мільёна рублёў (37,9 %).

Бюджэт вобласці на 2020 год сфарміраваны з дэфіцытам — 20,8 мільёна рублёў у сувязі з планаваным прыцягненнем крэдыту з рэспубліканскага бюджэту на фінансаванне расходаў капрамонту, набыццё і замену ліфтаў, а таксама дзякуючы размяшчэнню эмісійных каштоўных папер Аршанскім райвыканкамам і Віцебскім гарвыканкамам на будаўніцтва фермы ў вёсцы Чурылава ды дзіцячага садка і школы ў мікрараёне «Білева-2» адпаведна.

Аб'ём бюджэту вобласці па расходах вызначаны ў памеры больш чым 2,4 мільярда рублёў, што больш, чым у 2019-м, на 6,5 %.

Перад тым як на сесіі зацвердзілі бюджэт, адбылося сумеснае пасяджэнне прэзідыума аблсавета і аблвыканкама. Кіраўніцтва апошняга патрабуе разумна траціць бюджэтныя грошы, пралічваць, наколькі эфектыўна будуць акупляцца выдаткі на будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага прызначэння.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский радиозавод» (продавец) извещает о проведении 19 февраля 2020 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Местонахождение лотов: г. Гомель, ул. Объездная, 9		
1	**Станок токарно-винторезный 16К20 (инв. № 1014)**, г. в. 1975	**3400,00**	340,00
2	**Станок токарно-винторезный 250ИТВ (инв. № 2322)**, г. в. 1991	**7300,00**	730,00
3	**Станок токарно-винторезный 250ИТВ (инв. № 2442)**, г. в. 1994	**2100,00**	210,00
4	**Пневматический пресс НВ5222Б-01 (инв. № 686)**, г. в. 1973	**4200,00**	420,00

Продавец: ОАО «Гомельский радиозавод», г. Гомель, ул. Объездная, 9. Порядок **ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (044) 544-38-37 – Титков Виктор Семенович. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 17 января 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 17 февраля 2020 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

Як жыве сельсавет памерам у адну вёску

Часцяком даводзілася бываць у сельсаветах, якія складаюцца з трох, а то і чатырох дзясяткаў вёсак. У Баранавіцкім раёне, напрыклад, ёсць сельсавет, у склад якога ўваходзіць паўсотні населеных пунктаў. А вось Павіцце Кобрынскага раёна адно складае сельсавет. І так было заўсёды. Падобны адміністрацыйны расклад, відаць, абумоўлены геаграфічным становішчам вёскі. Павіцце размешчана крыху ўбаку ад іншых, схавалася за лясамі і балотамі на самым поўдні Кобрынскага раёна, на мяжы з Украінай.

АГАРОДЖУ — ТАЛАКОЙ

Тут з павагай ставяцца да старых звычаяў ды традыцый і разам з тым адчувальныя да ўсяго новага. Можа, дзень быў такі, але кабет за рулём аўто на вясковых вуліцах я сустрэла больш, чым мужчын. Ды што там аўтамабілізацыя — у час хуткаснага інтэрнэту адлегласці, тым больш аддаленасць ад гарадоў, часта выглядаюць умоўнымі. А вось прырода тут сапраўдная, раскошная. Праўда, туман у дзень майго наведвання стаяў выключны: на дзесяць метраў нічога не відаць. Таму цяжка было ўявіць у цэлым панараму вялікага населенага пункта.

— Людзі ў нас добрыя, гасцінныя, — расказвае **старшыня сельскага Савета Раіса ДЗЯЦУК.** — Некалі жылі ў цяжкіх, можна сказаць, суровых умовах бездарожжа, у атачэнні балот, перажывалі войны. Можа, таму навучыліся асаблівай талерантнасці, навучыліся любіць і цаніць жыццё. Я ганаруся тым, што працую ў вёсцы, дзе нарадзілася, выросла, адвучылася ў школе, дзе ўсіх ведаю і мяне ўсе знаюць, — кажа.

Раіса Сцяпанаўна працуе кіраўніком выканкама першае скліканне. Але на рахунку старшыні ёсць шэраг сумесных з аднавяскоўцамі добрых спраў. І першая з іх — добраўпарадкаванне старога пагоста. Гэтыя могілкі даўно закрытыя для пахаванняў, яны дзейнічалі з 1949 да 1966 года. Але ж там ляжаць землякі, да многіх з якіх ужо няма каму прыходзіць. З аднаго боку месца пахавання абгароджана, а з астатніх трох настойліва наступаў хмызняк.

Пачалі, як заўсёды, са сходаў і тлумачальнай работы. Зрабілі падборку фотаздымкаў, каб праілюстраваць стан могілак. Як высветлілася, не кожны там бываў за апошнія гады, а хтосьці і наогул не быў — у вёсцы жывуць не толькі карэнныя жыхары, нямала прыезджых. Але вяскоўцы праявілі разуменне, абсалютная большасць падтрымала прапанову прывесці ў парадак старыя вясковыя могілкі. Для рэалізацыі ідэі, вядома, патрабавалася фінансаванне. Аднадушна вырашылі сабраць грошы. Для гэтага абралі аргкамітэт па зборы сродкаў. У яго ўвайшлі прадстаўнікі кожнай вуліцы. Збор зрабілі абсалютна празрысты. Адказны з вуліцы ўносіў лічбы ў агульную ведамасць. Можна было адсочваць як збор грошай, так і іх расходаванне. Дарэчы, такія фінансавыя справаздачы існуюць у двух экзэмплярах: адзін знаходзіцца ў сельскім Савеце, другі — у царкве. Кожны ахвотны можа з імі азнаёміцца.

> Цяпер у вёсцы Павіцце і аднайменным сельсавеце жыве 1300 чалавек. У сярэдняй школе разам з садком навучаецца і выхоўваецца 176 дзяцей. Ёсць амбулаторыя, аддзяленне банка, пошта, працуюць чатыры крамы, з іх адна прыватная.

Такім чынам было сабрана 3052 рублі. Закупілі будаўнічыя матэрыялы. Спачатку правялі некалькі суботнікаў — патрабавалася выдаліць лішнюю расліннасць, прыбраць рэшткі дрэў, якія зносілі раней. Паводле слоў старшыні сельскага Савета, людзі праявілі разуменне і гаспадарлівасць. Напрыклад, будаўнічыя матэрыялы купілі, а куды іх везці адразу? Каля могілак няма адмысловага склада, а ў полі за некалькі кіламетраў ад вёскі іх не пакінеш. Адразу знаходзіўся нехта, хто прапаноўваў і размясціць агульную маёмасць на ўласным падворку пад паветкай альбо ў хляве. І так ва ўсім. Спецыялісты ЖКГ прыехалі праводзіць зварачныя работы, а мясцовыя мужчыны тут жа ўзяліся бетанаваць і ставіць слупы, нацягнулі сетку. Жанчыны дапамагалі фарбаваць трубы і слупы.

Старшыня сельскага Савета Раіса ДЗЯЦУК.

Такім чынам было ўзведзена 200 метраў агароджы з ацынкаванай сеткі. І могілкі ва ўрочышчы Рачак адразу набылі прыстойны выгляд, знікла адчуванне закінутасці, разбуранасці, якое ўзнікала пры поглядзе на гэтае месца спачыну. У агульнай справе паўдзельнічалі ўсе: хто дапамог рублём, хто рабочай сілай, а хто і тым, і другім. Як ужо гаварылася, участак ЖКГ правёў зварачныя работы, мясцовае сельгаспрадпрыемства выдзеліла транспарт. І варта сказаць, усё было праведзена хутка: у сярэдзіне жніўня аб'явілі агульную акцыю, а ў канцы верасня асноўныя работы былі скончаны. Падвялі вынікі і падзякавалі аднавяскоўцам за актыўную грамадзянскую пазіцыю на адным з мерапрыемстваў у Доме культуры.

Адзенне сцэны.

СПОНСАРСКІ ПАДАРУНАК

Павіццеўская культурная ўстанова нядаўна перажыла важную ў сваёй гісторыі падзею. Тут з'явілася новае адзенне сцэны. Так называецца заслона з рознымі дапаможнымі элементамі. А вось як яна з'явілася, варта расказаць асобна.

Вясной, напярэдадні Дня перамогі, работнікі Дома культуры па звычцы выйшлі навесці парадак каля помніка ваенным падзеям. Іх, дарэчы, у вёсцы тры. Асноўны манумент у выглядзе маці, якая смуткуе, стаіць на плошчы. Калі падмяталі і высаджвалі кветкі па перыметры, побач спынілася машына, выйшаў незнаёмы чалавек, загаварыў, стаў цікавіцца гісторыяй, пытаў, колькі людзей ваявала, колькі загінула, як падтрымліваецца памяць. Работнікі культуры расказвалі госцю пра трагічныя ваенныя падзеі, як вёска нацярпелася і падчас акупацыі, і пасля. Потым запрасілі яго ў Дом культуры, паказалі, дзе выступаюць самадзейныя артысты, дзе яны праводзяць рэпетыцыі, як займаюцца ўдзельнікі гурткоў. Чалавек, па ўсім было відаць, жыхар вялікага горада, можа, ніколі не быў у такіх вёсках, тым больш на Палессі...

А калі праводзілі гэтую імправізаваную экскурсію, дырэктар ДК проста да слова сказала: «Мы марым, што некалі знойдзецца спонсар, які падорыць нам новае адзенне сцэны». Госць адразу спытаў, колькі чалавек займаецца, падумаў, што гаворка ідзе пра сцэнічныя касцюмы для артыстаў. А калі растлумачылі, проста сказаў, што хацеў бы зрабіць нешта добрае для жыхароў гэтай вёскі і можа стаць тым самым спонсарам. Расійскі прадпрымальнік Андрэй Вячаслававіч Кобзеў гатовы быў адразу аплаціць патрэбнае вясковаму ДК убранне для сцэны і папрасіў разліковы рахунак, каб пералічыць грошы.

Але складанасці з пераводам расійскіх рублёў расцягнулі працэс спонсарскай дапамогі амаль на паўтара года. У выніку аднаму з памочнікаў Андрэя Кобзева давялося прыехаць у Мінск, каб аплаціць заказ Барысаўскаму камбінату дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. На прадпрыемстве ўважліва аднесліся да просьбы вясковага Дома культуры, аператыўна прыслалі эскізы, узоры тканіны, у сціслыя тэрміны выканалі заказ.

І цяпер Павіццеўскі ДК мае такое адзенне сцэны, якім можа пахваліцца далёка не кожная ўстанова культуры райцэнтра. З новым убраннем прайшло ўжо некалькі канцэртаў і іншых масавых мерапрыемстваў. Вядома, тут лічаць вялікай удачай спонсарскую дапамогу ў тры тысячы долараў у эквіваленце, што зрабіла магчымым набыццё патрэбнага аксесуара, які будзе служыць доўгія гады.

Помнік маці, якая смуткуе.

ТУТ ЖЫВЕ ПАМЯЦЬ

Той выпадковы мецэнат расказаў потым, што яго так кранула і чаму ён вырашыў зрабіць падарунак людзям менавіта з гэтай вёскі. У лесе, амаль на самай мяжы з Украінай, Андрэй Кобзеў убачыў помнік афіцэру Савецкай Арміі, які загінуў падчас вайны. І помнік той быў... дагледжаны, абгароджаны. Значыць, тут з павагай ставяцца да памяці аб ваенных падзеях.

— А як жа інакш? — разважае старшыня сельскага Савета. — З Павіцця на фронт пайшло 137 чалавек. З іх 72 загінула. У першыя дні акупацыі захопнікі расстралялі 57 яўрэяў, некалькі сельскіх актывістаў, у тым ліку дырэктара школы і яго намесніка. Апошняму было 19 гадоў, ён толькі прыехаў па накіраванні і прыступіў да работы. Лясы і балоты спрыялі дыслакацыі партызанскіх атрадаў, іх тут было нямала. А яшчэ ў лясах засядалі так званыя бандэраўцы, ад іх мясцовае насельніцтва пакутавала не толькі падчас вайны, але і некалькі гадоў пасля яе заканчэння. «Заўсёды ў гэтай мясцовасці Дзень перамогі быў святам са слязамі на вачах, — падкрэслівае **кіраўнік школьнага музея, настаўніца гісторыі Алена ГУСЕВА.** — Кожны год мы праводзім мерапрыемства, на якое прыходзіць шмат людзей. Нашы школьнікі — яго самыя актыўныя ўдзельнікі. Дзяцей выхоўваем так, каб яны ведалі сваю гісторыю.

Цяпер у вёсцы Павіцце і аднайменным сельсавеце жыве 1300 чалавек. У сярэдняй школе разам з садком навучаецца і выхоўваецца 176 дзяцей. Ёсць амбулаторыя, аддзяленне банка, пошта, працуюць чатыры крамы, з іх адна прыватная. Не закрывалі ў вёсцы лазню, што цяпер вялікая рэдкасць. Працуюць вяскоўцы ў сельгаспрадпрыемстве, лясніцтве, на тэрыторыі дзейнічаюць тры фермерскія гаспадаркі, зарэгістраваны некалькі індывідуальных прадпрымальнікаў. А вось шматдзетных сем'яў не так многа, як было раней, — цяпер іх толькі 19.

Святлана ЯСКЕВІЧ,
Кобрынскі раён.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении электронных торгов

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: **www.cpo.by**
Продавец	ОАО «Полесьеэлектромаш», ул. Красная, 179, 225644, Брестская область, г. Лунинец
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов

Лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179/ 14

Здание производственное (здание специализированное иного назначения) общей площадью 867 кв. м, инвентарный номер 133/С-17575. Составные части и принадлежности: забор.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 23.10.2067 г. для обслуживания производственного здания общей площадью 0,4132 га

Начальная цена с НДС 20 % — **66 419,06 белорусского рубля**

Лот № 2 – капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179В

Гараж (здание специализированное автомобильного транспорта) общей площадью 670,5 кв. м, инвентарный номер 133/С-17358. Составные части и принадлежности: бетонная площадка, ограждение, ограждение, ограждение, ворота.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 16.08.2065 г. для обслуживания гаража общей площадью 0,5164 га

Обременения: аренда. Подробная информация на сайте www.cpo.by

Начальная цена с НДС 20 % — **131 424,00 белорусского рубля**

Лот № 3 – капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Лунинец, ул. Красная, 179Г

Площадка для хранения материалов (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 473 кв. м, инвентарный номер 150/С-22101. Составные части и принадлежности: площадка из железобетонных плит, асфальтобетонная площадка, ограждение из бетонных плит на бетонных столбах, ограждение из металлической сетки на металлических столбах, ограждение кирпичное на кирпичных столбах.
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 16.08.2065 г. для обслуживания капитальных строений: площадка из железобетонных плит, асфальтобетонная площадка, ограждение из бетонных плит на бетонных столбах, ограждение из металлической сетки на металлических столбах, часть ограждения из кирпича на кирпичных столбах общей площадью 0,6382 га

Начальная цена с НДС 20 % — **48 048,00 белорусского рубля**

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов – **18.02.2020 г. в 11.00.** Окончание торгов – **18.02.2020 г. в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.02.2020г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by
Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

Общее собрание кредиторов ОАО «Трест Белтрансстрой» по вопросу утверждения изменений в план санации ОАО «Трест Белтрансстрой» состоится 30.01.2020 в 14.00 в актовом зале ГХУ Управления делами Президента Республики Беларусь по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 39 (малый актовый зал). С планом санации и альтернативным планом ликвидации ОАО «Трест Белтрансстрой» кредиторы могут ознакомиться на официальном сайте ОАО «Трест Белтрансстрой» www.trestbts.by.
УНП 100120922

В суд Лиозненского района поступило заявление об объявлении умершим **Рохликова Николая Ивановича,** 13 июля 1930 года рождения, уроженца д. Залесье Лиозненского района, последнее известное место жительства: Витебская область, Лиозненский район, д. Зубки, ул. Заречная, д. 25, с 14.12.2016 о его местонахождении не известно. Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, располагающим сведениями о Рохликове Н. И., сообщить их суду в течение двух месяцев с момента публикации по адресу: 211200, Витебская область, г. п. Лиозно, ул. Ленина,100 а, e-mail:@court.by

З ПОШТЫ «МС»

Масток паміж вёскамі... з дрэў

«Прашу вас прыняць меры па садзейнічанні азеляненню дарогі Грэск—Капыль, якая праходзіць праз вёску Грозава. Справа ў тым, што па рашэнні мясцовага райвыканкама былі высечаны ўсе дрэвы абапал аўтатрасы ад Грозава да Капыля. Вызваленыя плошчы засеяны кукурузай да самай дарогі. У адказ на мой зварот мясцовыя ўлады паведамілі, што гэтыя дрэвы былі аварыйныя, а ўзамен іх зроблены кампенсацыйныя пасадкі. Цяпер выгляд дарогі стаў пачварны. Як можна нявечыць пейзажы? Гэта ж турыстычны патэнцыял краю! Калі сапраўды таполі былі крохкія, чаму б не пасадзіць замест іх ліпы?» — такі ліст атрымала рэдакцыя ад свайго чытача з Капыльскага раёна.

У свой час таполі даволі шчыльна высаджвалі не толькі ў гарадах, але і паўз абочыны дарог за межамі населеных пунктаў. Гэтаму ёсць тлумачэнне: дрэвы хутка растуць. Але жыццё іх не такое доўгае, як, напрыклад, у дуба — ствалы хутка трухлеюць унутры і з цягам часу ствараюць пагрозу для людзей і іх маёмасці. Таму ў раёнах пастаянна праводзяцца планавыя аб'езды, вядзецца ўлік патэнцыйна небяспечных дрэў. У першую чаргу высякаюцца галіны і дрэвы, што навісаюць над газаправодамі, трасамі, магістралямі і нясуць небяспеку для жыццядзейнасці грамадзян і работы камунікацый.

— Таполі, якія раслі абапал аўтатрасы з боку Грозава, зрэзалі пры рэканструкцыі дарожнай артэрыі, ім было больш за сорак гадоў, — расказала **старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірына КІСЛЯК.**

— Што датычыцца кампенсацыйнага азелянення, то яно ўяўляе сабой аднаўленне або пасадку зялёных насаджэнняў замест ссечаных або пашкоджаных. Толькі летась на тэрыторыі сельсаветаў мы пасадзілі больш за дванаццаць тысяч дрэў, у населеных пунктах з'явіліся цэлыя плантацыі, ліквідавана шмат пустуючых участкаў.

Напрыклад, настаўнікі, вучні Ванелевіцкай сярэдняй школы Доктаравіцкага сельсавета ў пачатку мая высадзілі 75 бярозак, а восенню — алею з дубкоў і каштанаў. У Новых Доктаравічах з'явілася рабінавая алея, каля Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі зазелянела 70 маладых елак, а ў аграгарадку Цімкавічы ўладкаваны Парк сямейных дрэў.

На прылеглай тэрыторыі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва з'явіўся «Белы сад». Асаблівасць участка ў тым, што на ім растуць саджанцы, якія цвітуць у адной колеравай гаме — белай. Азеляненне і ўпрыгажэнне роднага краю — не толькі ініцыятыва мясцовых улад, грамадскіх арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў раёна: да справы ўсё больш актыўна падключаюцца і самі жыхары. Прынамсі, шматдзетная сям'я Калыханаў жыве ў вёсцы Душава, а побач цераз невялікую пустку — у Крывым Сяле — іх бабуля. Вось і вырашылі яны «перакінуць» своеасаблівы масток паміж вёскамі — пасадзіць дрэвы. Іх ідэю падтрымаў старшыня Пацейкаўскага сельвыканкама Сяргей Цвірко і дапамог знайсці саджанцы. У выніку тут зазелянела сорак маладых соснаў. Такіх руплівых, неабыякавых людзей, якія дбаюць аб развіцці сваёй малой радзімы, з кожным годам становіцца больш.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

КАЛЯДНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Нямецкая дабрачынная арганізацыя «Аб'яднанне дапамогі дзецям» з горада Ена зрабіла для краснапольскіх дзяцей падарункі амаль на 3,5 тысячы еўра.

Прадстаўнікі арганізацыі наведалі ВПК «Дзіцячы сад—сярэдняя школа» ў Казеллі, дзе вучацца і выхоўваюцца 92 дзіцяці, пабывалі ў дзіцячым садку ў аграгарадку Халмы, завіталі ў госці да дзяцей, якія выхоўваюцца ў двух дзіцячых дамах сямейнага тыпу ў Краснаполлі, і ў краснапольскі цэнтр карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі дзяцей.

— Упершыню дэлегацыя з гэтага горада пабывала ў нас у пачатку 90-х з мэтай аказаць дапамогу дзецям, пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — паведаміла **старшыня Краснапольскага райсавета дэпутатаў Анжаліка ГОМАН.** — З тых часоў працягваецца сяброўства. Штогод нашы дзеці ездзяць у нямецкія сем'і на аздараўленне, а нямецкія сябры па традыцыі наведваюць нас у навагоднія дні і прывозяць дзецям падарункі. Гэтым разам акрамя салодкіх прысмакаў яны падарылі лыжы з ботамі на суму каля 800 еўра, прывезлі цацкі, дыдактычныя гульні, канцтавары. Летась яны забяспечылі кабінет замежных моў казельскага ВПК наглядным вучэбным матэрыялам.

Не забываюцца нямецкія госці і пра тых дзяцей, якія ўжо закончылі школу і вучацца ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых установах адукацыі. Дарэчы, тым дзецям, якія першыя атрымалі дабрачынную дапамогу ад немцаў, сёння ўжо каля 40 гадоў. Цяпер на аздараўленне ў Германію ездзяць ужо іх дзеці.

На працягу амаль тыдня нямецкія госці паспелі таксама наведаць сем'і, адкуль да іх на аздараўленне прыязджаюць дзеці, сустрэцца з мясцовай уладай, абмеркаваць планы далейшага супрацоўніцтва. Для іх, у сваю чаргу, была арганізавана шырокая культурная праграма, у тым ліку з паездкай у гомельскі цырк.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва Краснапольскага райсавета.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А., ЦУПРЫК Л. А., ПАПКО В. М., БЕЛЯКОЎ А. Э., ПАНАСЮК В. В., ДРЫЛЁНАК Т. Л., СУШЧАНКА М. Л.**

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 14.804. **Нумар падпісаны ў 19.30 16 студзеня 2019 года.**